Энцыкліка

*LUMEN FIDEI*

Святога Айца

Францішка

да біскупаў, прэзбітэраў і дыяканаў,
да кансэкраваных асобаў
і да ўсіх свецкіх вернікаў
Пра веру

Пераклад Секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў
і афіцыйных дакументаў Касцёла
Камісіі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў
пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі

[pdf]

1. Святло веры (*Lumen fidei*): гэтым выразам традыцыя Касцёла назвала вялікі дар, які прынёс Езус і які вось так прадстаўлены ў Евангеллі паводле св. Яна: «Я, святло, прыйшоў на свет, каб кожны, хто верыць у Мяне, не заставаўся ў цемры» (12, 46). Св. Павел таксама кажа тымі самымі словамі: «Таму што Бог, які загадаў: “Няхай з цемры заззяе святло”, засвяціў у нашых сэрцах» (*2*  4, 6). У язычніцкім свеце, які прагнуў святла, развіўся культ бога Сонца, *Sol invictus*, якога заклікалі на світанні. Хоць сонца ўзыходзіла штодзённа, было вядома, што яно не можа сваім святлом ахапіць усю экзістэнцыю чалавека. Сонца не асвятляе ўсёй рэчаіснасці; яго промень не можа пранікнуць у змрок смерці, дзе вока чалавека закрываецца на яго святло. Св. Юстын Мучанік сцвярджае: «Ніхто ніколі не сустрэў нікога гатовага памерці за сваю веру ў сонца» [1] . Хрысціяне, разумеючы, які вялікі гарызонт адкрывае перад імі вера, называлі Хрыста сапраўдным сонцам, «промні якога даюць жыццё» [2] . Марце, якая аплаквала смерць брата Лазара, Езус кажа: «Ці не казаў Я табе, што, калі будзеш верыць, убачыш славу Божую?» ( 11, 40). Хто верыць – бачыць;

бачыць дзякуючы святлу, якое асвятляе ўвесь шлях, бо прыходзіць яно да нас ад уваскрослага Хрыста, ранішняй зоркі, якая ніколі не заходзіць.

Ілюзорнае святло?

2. Аднак, калі гаворым пра святло веры, можам сустрэцца з пярэчаннем нашых сучаснікаў. У эпоху новай гісторыі лічылася, што гэтае святло магло задаволіць старажытнае грамадства, але яно не патрэбна ў новыя часы, калі чалавек пасталеў, стаў ганарыцца сваім розумам і жадае па-новаму даследаваць будучыню. Таму вера стала ўяўляцца як ілюзорнае святло, якое перашкаджае чалавеку з адвагай здабываць веды. Малады Ніцшэ заахвочваў сваю сястру Альжбету, каб яна рызыкнула і пайшла «новымі дарогамі <…> у няўпэўненасці самастойнага крочання наперад». І дадаваў: «У гэтым пункце разыходзяцца шляхі чалавецтва: калі хочаш дасягнуць спакою душы і шчасця, то вер, а калі хочаш быць вучнем праўды, тады даследуй» [3] . Быццам бы вера перашкаджае пошуку. Зыходзячы з гэтага, Ніцшэ будзе крытыкаваць хрысціянства за тое, што яно звузіла абсяг чалавечай экзістэнцыі, пазбаўляючы жыццё навізны і прыгоды, што вера нібы ілюзія святла, якая ўскладняе нам, свабодным людзям, шлях да будучыні.

3. У гэтым працэсе вера стала ў выніку асацыіравацца з цемрай. Лічылі, што можна яе захаваць, знайсці для яе прастору, каб яна магла суіснаваць са святлом розуму. Прастора для веры адкрывалася там, дзе розум не мог асвятліць, дзе чалавек ужо не мог мець упэўненасці. Таму веру разумелі як уцёкі, выкліканыя недахопам святла, пад уплывам сляпога пачуцця, або як суб'-ектыўнае святло, якое можа распаліць сэрца, прынесці суцяшэнне, але якога нельга прапанаваць іншым як аб'-ектыўнае, агульнае святло, што асвятляе шлях. Аднак паступова заўважалі, што аўтаномнае святло розуму не можа ў поўнай меры растлумачыць будучыню; у выніку яна хаваецца ў змроку і пакідае чалавека ў боязі перад невядомым. І так чалавек адмовіўся ад пошуку вялікага святла, каб задаволіцца малым святлом, якое асвятляе кароткую хвіліну, але не можа адкрыць дарогі. Калі няма святла, усё становіцца няясным, чалавек не можа адрозніць дабра ад зла, дарогі, што вядзе да мэты, ад дарогі, на якой ён блукае без кірунку.

Святло, якое нанова трэба адкрыць

4. Таму неабходна адшукаць святло, якое з'яўляецца характэрнай рысай веры, бо калі гасне яе промень, усе іншыя свяцілы губляюць урэшце свой бляск. Святло веры мае асаблівы характар, бо здольнае асвятліць  жыццё чалавека. А каб святло было настолькі магутным, яно не можа паходзіць ад нас саміх, яно павінна паходзіць з самай першай крыніцы, павінна,

урэшце, паходзіць ад Бога. Вера нараджаецца ў сустрэчы з жывым Богам, які заклікае нас і паказвае нам сваю любоў, любоў, якая апярэджвае нас, на якую мы можам абаперціся, каб нязломна трываць і будаваць жыццё. Перамененыя гэтай любоўю, мы атрымліваем новыя вочы, адчуваем, што ў ёй змешчана вялікае абяцанне поўні, і кіруем позірк у будучыню. Вера, якую прымаем ад Бога як звышпрыродны дар, становіцца святлом на шляху, які ўказвае кірунак нашай вандроўкі ў часе. З аднаго боку, яна паходзіць з мінулага, з’яўляецца святлом памяці пра Заснавальніка, пра жыццё Езуса, дзе ў поўні аб’явілася Яго сапраўдная любоў, здольная перамагчы смерць. Аднак у той жа час, паколькі Хрыстус уваскрос і вядзе нас за парог смерці, вера з’яўляецца святлом, якое прамяніцца з будучыні, якое адкрывае перад намі вялікія гарызонты і кіруе нас па-за нашыя адасобленыя «я» да шырокай камуніі. Таму мы разумеем, што вера не жыве ў змроку; яна з’яўляецца святлом для нашай цемры. Дантэ ў «Боскай камедыі», у Раі, пасля вызнання сваёй веры перад св. Пятром, апісвае яе як «іскру, // якая на світанні распальваецца штораз большым агнём // і з’яўляецца маёй зоркай на зеніце неба» [4] . Менавіта пра гэтае святло веры я хацеў бы сказаць, каб яно павялічвалася, каб асвятляла сучаснасць і стала зоркай, што паказвае гарызонты нашага вандравання ў часы, калі чалавек асабліва патрабуе святла.

5. Перад сваёй мукаю Пан упэўніў Пятра: «Я папрасіў за цябе, каб не знікла твая вера» ( 22, 32). Затым наказаў яму ўмацоўваць сваіх братоў менавіта ў гэтай веры. Усведамляючы заданне, даручанае Пятру, Бэнэдыкт XVI пажадаў абвясціць гэты Год веры, час ласкі, які дапамагае нам адчуць вялікую радасць, што дае вера, ажывіць пазнанне шырокіх гарызонтаў, якія адкрывае вера, каб вызнаваць яе ў еднасці і ў поўні, будучы вернымі памяці Пана, умацаванымі Яго прысутнасцю і дзеяннем Духа Святога. Перакананне веры, якая чыніць жыццё вялікім і поўным, сканцэнтраваным на Хрысце і на моцы Яго ласкі, ажыўляла місію першых хрысціянаў. У   чытаем такі дыялог рымскага прэфекта Рустыка з хрысціянінам Гераксам: «Дзе твае бацькі?» – спытаў суддзя ў мучаніка, а той адказаў: «Нашым сапраўдным айцом з’яўляецца Хрыстус, а нашай маці – вера ў Яго» [5] . Для гэтых хрысціянаў вера як сустрэча з жывым Богам, аб’яўленым у Хрысце, была «маці», бо нараджала іх для дзённага святла, нараджала ў іх Божае жыццё, новы досвед, поўнае бляску бачанне жыцця, таму яны былі гатовыя да канца даваць публічнае сведчанне.

6. Год веры распачаўся ў 50-ю гадавіну адкрыцця Другога Ватыканскага Сабору. Гэтае супадзенне дазваляе нам заўважыць, што *Vaticanum II* быў Саборам пра веру [6] , бо заклікаў нас ставіць у цэнтры нашага касцёльнага і асабістага жыцця першынство Бога ў Хрысце. Бо Касцёл ніколі не разглядаў веры як відавочнага факту, але разумее, што гэты Божы дар трэба карміць і ўмацоў-ваць, каб ён надалей указваў дарогу. Другі Ватыканскі Сабор паказаў бляск веры ў чалавечым досведзе, ахоп-ліваючы гэтым самым шляхі сучаснага чалавека. Такім чынам стала зразумелым, што вера ўзбагачае чалавечае існаванне ва ўсіх яго вымярэннях.

7. Гэтыя разважанні на тэму веры – згодна з тым, што Настаўніцкі Інстытут Касцёла сказаў

пра гэтую боскую цноту [7] , – жадаю дадаць да таго, што Бэнэ- дыкт XVI напісаў у энцыкліцы пра любоў і надзею. Ён амаль скончыў працу над першым варыянтам энцыклікі пра веру. Я нязмерна ўдзячныяму за гэта і ў духу Хрыстовага братэрства прымаю яго каштоўную працу, да-даючы да тэксту некалькі разважанняў. Наступнік Пятра, учора, сёння і заўтра, заўсёды пакліканы ўмацоў-ваць братоў у гэтым невымерным скарбе, якім з'яўляецца вера, якую Бог дае як святло на шляху кожнага чалавека.

У веры, якая з'яўляецца дарам Бога, звышпрыроднай цнотай, спасланай Ім, мы прызнаём ахвяраваную нам вялікую Любоў, скіраванае да нас добрае Слова, і, калі мы прымаем гэтае Слова, якім ёсць Езус Хрыстус, уцелаўлёнае Слова, Дух Святы перамяняе нас, асвятляе шлях будучыні, і ў нас узрастаюць крылы надзеі, каб мы ішлі гэтай дарогай з радасцю. Вера, надзея і любоў у вартым здзіўлення спалучэнні накіроўваюць хрысціянскае жыццё да поўнай камуніі з Богам. Якую дарогу ад-крывае перад намі вера? Адкуль паходзіць яе магутнае святло, што дазваляе асвятліць дарогу шчаслівага і плённага жыцця?

# РАЗДЗЕЛ І

## МЫ ПАВЕРЫЛІ Ў ЛЮБОЎ
(пар. 1 4, 16)

### Абрагам, наш айцец у веры

8. Вера адкрывае нам дарогу і спадарожнічае нам на працягу гісторыі. Калі мы хочам зразумець, чым з'яўляецца вера, мы павінны расказаць пра яе гісторыю, пра дарогу веруючых людзей, аб якой у першую чаргу сведчыць Стары Запавет. Асаблівае месца займае Абрагам, наш айцец у веры. У яго жыцці адбываецца незвычайная рэч: Бог скіроўвае да яго Слова, аб'яўляецца як Бог, які гаворыць і кліча па імені. Вера спалучана са слуханнем. Абрагам не бачыць Бога, але чуе Яго голас. Такім чынам вера набывае асабісты характар. Таму Бог не з'яўляецца Богам нейкага месца і нават не звязаны з нейкім адмысловым святым часам, але з'яўляецца Богам асобы, менавіта Богам Абрагама, Ісаака і Якуба, здольным устанаўліваць кантакт з чалавекам і заключаць з ім запавет. Вера – гэта адказ на Слова, скіраванае да асобы, адказ, дадзены канкрэтнаму «Ты», якое кліча нас па імені.

9. Тое, што Слова кажа Абрагаму, складаецца з зак-ліку і абяцання. Перш за ўсё гэта заклік выйсці са сваёй зямлі, гэта запрашэнне нанова адкрыцца на новае жыццё, гэта пачатак выйсця, што адкрывае дарогу да невядомай будучыні. Бачанне, якое вера дасць Абрагаму, заўсёды будзе звязана з гэтым крокам наперад, які трэба зрабіць: вера «бачыць» настолькі, наколькі развіваецца, наколькі ўваходзіць у адкрытую Божым Словам прастору. Больш за тое, гэтае Слова змяшчае абяцанне: тваё патомства будзе шматлікім, будзеш айцом вялікага народу (пар. 13, 16; 15, 5; 22, 17). Гэта праўда, што як адказ на Слова, якое апярэджвае яе, вера Абрагама заўсёды будзе актам памяці. Аднак гэтая памяць не замыкаецца ў мінулым, але, як памяць пра абяцанне, адкрываецца на будучыню, становіцца здольнай асвятліць шлях. Таму бачна, што вера, як памяць пра будучыню, *memoria futuri*, цесна звязана з надзеяй.

10. Тое, што павінен зрабіць Абрагам, – гэта даверыцца Слову. Вера разумее, што слова, рэч з выгляду кароткатрывалая і знікомая, калі сказана верным Богам, становіцца найбольш пэўнай з усіх рэчаў і нязменнай, бо робіць магчымай нашую далейшую вандроўку ў часе. Вера прымае гэтае Слова як моцную скалу, на якой можна будаваць як на салідным падмурку. Таму ў Бібліі вера акрэслена габрэйскім словам *'emûnah*, якое паходзіць ад дзеяслова *'aman*, корань якога азначае «падтрымліваць». Паняцце *'emûnah* можа азначаць як вернасць Бо-га, так і веру чалавека. Чалавек верны атрымлівае сілу, калі даручае сябе ў рукі вернага Бога. Звяртаючыся да абодвух значэнняў гэтага слова – прысутных таксама ў адпаведных ім словах: грэцкім (*pistòs*) і лацінскім (*fi-de-lis*) – св. Кірыл Ерузалемскі падкрэслівае годнасць хрысція-ніна, які атрымлівае тое ж імя, што і Бог: адзін і другі названыя «вернымі» [8]. Св. Аўгустын тлумачыць гэта так: «Чалавек верыць абяцанням Бога. Верны Бог выконвае тое, што абяцаў чалавеку» [9].

11. Яшчэ адзін аспект гісторыі Абрагама з’яўляецца істотным для зразумення яго веры. Божае Слова, нават калі нясе ў сабе навізну і нечаканасць, не з’яўляецца чымсьці далёкім ад досведу Патрыярха. У голасе, які звяртаецца да Абрагама, ён распазнае глыбокі заклік, спрадвеку ўпісаны ў яго сэрца. Бог спалучае сваё абяцанне з месцам, дзе жыццё чалавека заўсёды выглядае шматабяцальным: ёсць у ім бацькоўства, нараджэнне новага жыцця: «Сара, жонка твая, народзіць табе сына, і дасі яму імя Ісаак» ( 17, 19). Бог Абрагама, які просіць, каб ён цалкам Яму даверыўся, аб’яўляецца як крыніца, з якой паходзіць усялякае жыццё. Такім чынам вера звязана з Божым бацькоўствам, з якога ўзнікае стварэнне: Бог, які кліча Абрагама, ёсць Богам Стварыцелем, тым, які «кліча няіснае да існавання» ( 4, 17), тым, які «выбраў нас у Ім перад стварэннем свету, <…> прадвызначыў нас для ўсынаўлення» ( 1, 4-5). Вера ў Бога асвятляе найглыбейшую сутнасць Абрагама, дазваляе яму распазнаць крыніцу дабрыні, якая з’яўляецца пачаткам усяго, а таксама пераканацца, што яго жыццё не паходзіць з небыцця або з выпадку, але з закліку і любові да асобы. Таямнічы Бог, які паклікаў яго, не з’яўляецца чужым Богам, але тым, які ёсць пачаткам усяго і ўсё падтрымлівае. Вялікае выпрабаванне веры Абрагама, прынясенне ў ахвяру сына Ісаака, паказвае, да якой ступені гэтая першасная любоў здольная гарантаваць жыццё таксама і пасля смерці. Слова, якое было здольнае паклікаць да жыцця сына ў яго «амярцвелым» целе і ў «амярцвелым улонні» бясплоднай Сары (пар.  4, 19), зможа таксама быць гарантыяй абяцання, звязанага з будучыняй, незалежна ад усялякіх пагрозаў або небяспекаў (пар.  11, 19;  4, 21).

Вера Ізраэля

12. Гісторыя ізраэльскага народу ў Кнізе Зыходу працягвае шлях веры Абрагама. Вера зноў нараджаецца з першаснага дару: Ізраэль адкрываецца на дзеянне Бога, які прагне вызваліць яго з нядолі. Вера паклікана да доўгай вандроўкі, каб змагчы адараваць Пана на Сінаі і ўзяць ва ўласнасць абяцаную зямлю. Божая любоў мае рысы айца, які нясе сына падчас усёй дарогі (пар.  1, 31). Вызнанне веры Ізраэля набывае форму апавядання пра дабрадзействы Бога, пра Яго дзейнасць, каб вызваліць народ і весці яго (пар.  26, 5-11), і гэтае апавяданне народ пераказвае з пакалення ў пакаленне. Божае Святло свеціць Ізраэлю праз чыны, здзейсненыя Панам, якія згадваюцца і вызнаюцца ў кульце, пераказваюцца бацькамі дзецям. Так мы даведваемся, што святло, якое нясе вера, звязана з канкрэтным апавяданнем пра жыццё, з удзячным успамінам дабрадзействаў, атрыманых ад Бога, і паступовым спаўненнем Яго абяцанняў. Гэта вельмі добра выявіла гатычная архітэктура: у вялікіх катэдрах святло сыходзіць з неба праз вітражы, на якіх прадстаўлена святая гісторыя. Божае Святло даходзіць да нас праз апавяданне пра Яго Аб’яўленне, таму можа асвятліць нашую дарогу ў часе, нагадваючы пра Божыя дабрадзействы, паказваючы, як спаўняюцца Яго абяцанні.

13. Гісторыя Ізраэля паказвае нам таксама спакусу бязвер'я, у якую шматразова трапляў народ. Супрацьлегласцю веры з'яўляецца тут ідалапаклонства. Калі Майсей размаўляе з Богам на Сінаі, народ не можа вытрымаць таямніцы ўкрытага Божага аблічча, не можа знесці часу чакання. Паводле сваёй прыроды вера патрабуе адмаўлення ад жадання мець адразу тое, што, як здаецца, прапануе зрок, з'яўляецца запрашэннем ад-крыцца на крыніцу святла, ушаноўваючы таямніцу Аблічча, якое мае намер аб'явіцца асабіста і ў адпаведны час. Марцін Бубер прыводзіў азначэнне ідалапаклонства, сфармуляванае рабінам з Коцка. З ідалапаклонствам мы сутыкаемся тады, «калі звяртаецца поўнае пашаны аблічча да аблічча, якое не з'яўляецца абліччам» [10] . Замест таго, каб верыць у Бога, чалавек жадае ўшаноўваць ідала, аблічча якога можна адлюстраваць і паходжанне якога вядомае, бо ён учынены намі. У выпадку ідала няма небяспекі магчымага паклікання, якое патрабавала б вырачэння ўласнага пачуцця бяспекі, бо ідалы «маюць вусны, але не гавораць» ( 115, 5). Таму мы разумеем, што ідал з'яўляецца выдуманай прычынай для таго, каб паставіць саміх сябе ў цэнтр рэчаіснасці, пакланяючыся справе ўласных рук. Чалавек, калі губляе асноўны напрамак, які яднае яго жыццё, губляецца ў разнастайнасці сваіх жаданняў. Баронячыся ад чакання часу абяцання, ён распыляецца на тысячы хвілінаў сваёй гісторыі. Таму ідалапаклон- ства – гэта заўсёды політэізм, рух без мэты ад аднаго гаспадара да другога. Ідалапаклонства не паказвае адной дарогі, але шмат шляхоў, якія не вядуць да выразнай мэты, а хутчэй ствараюць лабірынт. Хто не хоча даверыцца Богу, вымушаны слухаць галасы многіх ідалаў, якія клічуць яго: «Даверся мне». Вера, паколькі звязана з навяртаннем, з'яўляецца супрацьлегласцю ідалапаклонства; гэта аддаленне ад ідалаў дзеля вяртання да жывога Бога праз асабістую сустрэчу. Ве- рыць – значыць даверыцца міласэрнай любові, якая заўсёды прымае і прабачае, падтрымлівае і накіроўвае існаванне, становіцца магутнай у сваёй здольнасці раўняць скрыўленні нашай гісторыі. Вера заключаецца ў гатоўнасці адкрыцца на ўсцяж новую перамену, якую здзяйсняе Божы заклік. Вось парадокс: няспынна звяртаючыся да Пана, чалавек знаходзіць пастаянную дарогу, што вызваляе яго ад хаатычных рухаў, да якіх змушаюць яго ідалы.

14. У веры Ізраэля з'яўляецца таксама постаць Майсея, пасрэдніка. Народ не можа сузіраць аблічча Бога. Гэта Майсей размаўляе з ТЫМ, ЯКІ ЁСЦЬ (YHWH), на гары і перадае ўсім волю Пана. Дзякуючы пасрэдніку Ізраэль навучыўся вандраваць у з'яднанні. Акт веры асобнага чалавека ўпісваецца ў супольнасць, у супольнае «мы» народу, які ў веры ёсць як бы адным чалавекам, «сынам маім першародным», як назаве Бог увесь Ізраэль (пар.  4, 22). Пасрэдніцтва становіцца не перашкодай, але адкрыццём: пры сустрэчы з іншымі мы скі-роўваем позірк да праўды, якая нас пераўзыходзіць. Ж. Ж. Русо скардзіўся, што не можа асабіста ўбачыць Бога: «Колькі ж людзей паміж Богам і мною!» [11] «Ці гэта так проста і натуральна, што Бог пайшоў да Майсея, каб гаварыць да Жана Жака Русо?» [12] . Беручы за пункт выйсця індывідуалістычную і абмежаваную канцэпцыю пазнання, нельга зразумець сэнсу пасрэдніцтва, гэтай здольнасці ўдзельнічаць у візіі іншага чалавека, дзялення пазнаннем, пазнаннем, уласцівым для любові. Ве- ра – бескарыслівы дар Бога, які патрабуе пакоры і адвагі, каб паверыць і даверыцца, і такім чынам заўважыць ясную дарогу сустрэчы

паміж Богам і людзьмі, гісторыю збаўлення.

Паўната хрысціянскай веры

15. «Абрагам <…> рады быў убачыць дзень Мой; і ўбачыў, і ўзрадаваўся» ( 8, 56). Згодна з гэтымі словамі Езуса, вера Абрагама была скіравана да Яго, была ў пэўным сэнсе падрыхтоўкай для таго, каб бачыць Яго таямніцы. Так разумее гэта св. Аўгустын, калі сцвяр-- джае, што Патрыярхі былі збаўленыя ў веры, не ў веры ў Хрыста, які ўжо прыйшоў, але ў веры ў Хрыста, які павінен прыйсці, у веры, скіраванай да будучыні, якая звязана з Езусам [13] . Хрысціянская вера сканцэнтравана на Хрысце, з'яўляецца вызнаннем, што Езус ёсць Панам і што Бог уваскрасіў Яго з мёртвых (пар.  10, 9). Усе фрагменты са Старога Запавету сыходзяцца ў Хрысце, Ён становіцца канчатковым «так» для ўсіх абяцанняў, фундаментам нашага канчатковага «Амэн», сказанага Богу (пар. *2*  1, 20). Гісторыя Езуса – гэта поўнае аб'-яўленне верагоднасці Бога. Калі Ізраэль успамінаў вялі-кія справы Божай любові, якія былі цэнтрам яго вызнання і адкрывалі зрок яго веры, сённяшняе жыццё Езуса з'яўляецца нібы месцам канчатковай інтэрвенцыі Бога, найвышэйшым праяўленнем Яго любові да нас. У Езусе Бог не скіроўвае да нас дадатковае слова сярод многіх іншых, але сваё спрадвечнае Слова (пар.  1, 1-2). Бог не мог даць нам большай гарантыі, каб пераканаць нас у сваёй любові, як нагадвае нам св. Павел (пар.  8, 31-39). Такім чынам хрысціянская вера з'яўляецца верай у поўную Любоў, у яе плённую моц, у яе здольнасць перамяняць свет і тлумачыць час: «І мы пазналі, і паверылі ў любоў, якую мае да нас Бог» (*1*  4, 16). У Божай любові, аб'яўленай у Езусе, вера заўважае фундамент, на якім грунтуецца рэчаіснасць і яе канчатковае прызначэнне.

16. Найбольшым доказам верагоднасці любові Хрыста з'яўляецца Яго смерць за чалавека. Калі ахвяраванне жыцця за сяброў з'яўляецца найвышэйшым доказам любові (пар.  15, 13), то Езус ахвяраваў сваё жыццё за ўсіх, таксама за тых, хто быў ворагам, каб такім чынам перамяніць сэрцы. Вось чаму Евангелісты гадзіну Крыжа лічылі кульмінацыйным момантам позірку веры: у гэтай гадзіне яснее бляск велічы і глыбіні Божай любові. Св. Ян змясціў тут сваё ўрачыстае сведчанне, калі разам з Маці Езуса глядзіць на таго, каго прабілі (пар.  19, 37): «А той, хто ўбачыў, засведчыў, і сведчанне яго праўдзівае. І ён ведае, што кажа праўду, каб і вы паверылі» ( 19, 35). У сваім творы «Ідыёт» Ф. М. Дастаеўскі ўкладвае ў вусны героя, князя Мышкіна, які глядзіць на вобраз мёртвага Хрыста ў гробе, карціну Ганса Гольбейна Малодшага, наступныя словы: «З прычыны гэтага вобраза хтосьці мог бы страціць веру» [14] . Бо карціна паказвае вельмі брутальна знішчальныя вынікі дзеяння смерці на целе Хрыста. Але менавіта праз сузіранне смерці Езуса ўмацоўваецца вера, атрымліваючы яркае святло, калі яна прадстае як вера ў Яго непарушную любоў да нас, здольную ўвайсці ў смерць, каб нас збавіць. Магчыма верыць у гэтую любоў, якая не ўхіляецца ад смерці, каб паказаць, як моцна мяне любіць; яе бязмежнасць перамагае ўсялякія падазрэнні і дазваляе нам у поўні

даверыцца Хрысту.

17. Вось жа, смерць Хрыста адкрывае поўную сапраўднасць Божай любові, калі глядзім на яе ў святле Яго ўваскрасення. Уваскрослы Хрыстус з’яўляецца верагодным сведкам (пар. 1, 5; 2, 17), моцнай падтрымкай для нашай веры. «А калі Хрыстус не ўваскрос, то вера ваша марная», – сцвярджае св. Павел (*1* 15, 17). Калі б любоў Айца не ўчыніла таго, што Езус паўстаў з мёртвых, калі б не змагла вярнуць жыццё Яго целу, не была б у поўні сапраўднай любоўю, здольнай асвятліць таксама цемру смерці. Калі св. Павел кажа пра сваё новае жыццё ў Хрысце, ён мае на ўвазе веру «ў Сына Божага, які палюбіў мяне і аддаў сябе за мяне» ( 2, 20). Без сумнення гэтая вера ў Божага Сына ёсць вераю Апостала Народаў у Езуса, але яна прадугледжвае таксама сапраўднасць Езуса, яна мае сваю падставу ў Яго любові аж да смерці, а таксама ў Яго быцці Сынам Божым. Мена-віта таму, што Езус з’яўляецца Сынам, што цалкам укаранёны ў Айцу, Ён мог перамагчы смерць і дазволіць заяснець паўнаце жыцця. Наша культура страціла здольнасць заўважаць канкрэтную прысутнасць Бога, Яго дзеянне ў свеце. Мы думаем, што Бог знаходзіцца дзесьці далёка, на іншым узроўні рэчаіснасці, аддзелены ад нашых канкрэтных адносін. Калі б так было, калі б Бог не быў здольны дзейнічаць у свеце, Яго любоў не была б сапраўды магутнай, сапраўды рэальнай, а значыць не была б нават сапраўднай любоўю, здольнай гарантаваць тое шчасце, якое абяцае. Тады было б абсалютна ўсё роўна, ці верыць у Яго, ці не верыць. Аднак жа хрысціяне вызнаюць канкрэтную і магутную любоў Бога, які сапраўды дзейнічае ў гісторыі і вырашае яе канчатковы лёс. Гэтую любоў можна сустрэць, яна ў поўні аб’явілася праз муку, смерць і ўваскрасенне Хрыста.

18. Паўната, да якой Езус прыводзіць веру, мае яшчэ адзін вырашальны аспект. У веры Хрыстус з’яўляецца не толькі тым, у каго мы верым, найвышэйшым аб’яўленнем Божай любові, але таксама тым, з кім мы яднаемся, каб верыць. Вера не толькі глядзіць на Езуса, але глядзіць з пункту гледжання Езуса, Яго вачыма: з’яўляецца ўдзелам у Яго спосабе глядзець. У многіх сферах жыцця мы давяраем іншым асобам, якія лепш за нас ведаюць справу. Давяраем архітэктару, які будуе наш дом, фармацэўту, які дае нам лекі дзеля нашага выздараўлення, адвакату, які абараняе нас у судзе. Мы таксама патрабуем кагосьці, хто быў бы надзейным экспертам у справах Бога. Езус, Яго Сын, ёсць тым, хто вучыць аб Богу (пар. 1, 18). Жыццё Хрыста, Яго спосаб пазнання Айца, абсалютнае жыццё ў адносінах з Ім, адкрывае перад жыццём чалавека новую прастору, і мы можам у яе ўвайсці. Св. Ян выказаў важнасць асабістых адносінаў з Езусам для нашай веры, карыстаючыся па-рознаму дзеясловам . Акрамя «веры ў тое, што» праўдай ёсць тое, што кажа Езус (пар. 14, 10; 20, 31), Ян выкарыстоўвае таксама выразы: «верыць» Езусу, а таксама «верыць у» Езуса. «Верым» Езусу, калі прымаем Яго слова, Яго сведчанне, бо Ён праўдзівы (пар. 6, 30). «Верым у» Езуса, калі асабіста Яго прымаем у нашым жыцці, калі далучаемся да Яго ў любові, а таксама калі крочым за Ім на нашым шляху (пар. 2, 11; 6, 47; 12, 44).

Каб мы змаглі пазнаць Яго, прыняць і наследаваць, Сын Божы прыняў нашае цела і праз

гэта глядзеў на Айца таксама як чалавек, вандруючы і жывучы ў часе. Хрысціянская вера – гэта вера ва Уцелаўлёнае Слова, а таксама ў Яго ўваскрасенне ў целе; гэта вера ў Бога, які наблізіўся да нас настолькі, што ўвайшоў у нашую гісторыю. Вера ў Божага Сына, які стаў чалавекам у Езусе з Назарэта, не аддаляе нас ад рэчаіснасці, але дазваляе нам зразумець яе глыбінную сутнасць, адкрыць, наколькі Бог любіць гэты свет і надалей накіроўвае яго да сябе; у выніку хрысціянін штораз больш удзельнічае і мацней перажывае сваю вандроўку на зямлі.

Збаўленне праз веру

19. Зыходзячы з гэтага ўдзелу ў спосабе гледжання Езуса, апостал Павел у сваіх пасланнях даў нам апісанне жыцця веруючага чалавека. Веруючы, прымаючы дар веры, перамяняецца ў новае стварэнне. Атрымлівае новае існаванне, існаванне сыноўскае, становіцца сынам у Сыне. «*Abba* – Ойча» найбольш характэрнае слова з досведу Езуса, якое становіцца цэнтрам хрысці-янскага досведу (пар.  8, 15). Жыццё ў веры, як сыноўскае жыццё, ёсць прызнаннем першаснага і радыкальнага дару, які з’яўляецца падставай існавання чалавека, і можна яго выказаць у словах св. Паўла, скіраваных да Карынцянаў: «Што ж маеш ты, чаго б не атрымаў?» (*1*  4, 7). Менавіта гэта з’яўляецца кантэкстам палемікі св. Паўла з фарысеямі, дыскусіі на тэму збаўлення праз веру або праз учынкі Закону. Св. Павел ад-кідвае паставу чалавека, які хоча апраўдацца перад Богам сваімі ўчынкамі. Такі чалавек, нават калі выконвае запаведзі, нават калі здзяйсняе добрыя ўчынкі, ставіць сябе ў цэнтры і не прызнае, што крыніцай дабрыні ёсць Бог. Хто так паступае, хто хоча быць крыніцай уласнай справядлівасці, заўважае, што яна хутка вычэрпваецца, а таксама адкрывае, што не можа нават быць верным Закону. Замыкаецца ў сабе, аддзяляецца ад іншых, і перш-наперш ад Пана, таму яго жыццё становіцца дарэмным, яго ўчынкі бясплоднымі, ён становіцца як дрэва, што стаіць далёка ад вады. Св. Аўгустын так выказвае гэта сваёй канкрэтнай і трапнай мовай: «A*b eo qui fecit te noli deficere nec ad te*» – «ад таго, хто цябе ўчыніў, не адыходзь, нават калі ідзеш да сябе» [15] . Калі чалавек думае, што адшукае самога сябе, аддаляючыся ад Бога, яго існаванне становіцца паражэннем (пар.  15, 11-24). Пачаткам збаўлення становіцца адкрыццё на штосьці, што папярэднічае, на першасны дар, які пацвярджае і захоўвае жыццё. Толькі праз ад-крыццё на гэты пачатак і яго прызнанне мы можам перамяніцца, дазваляючы, каб у нас споўнілася збаўленне, а жыццё стала плённым, поўным добрых пладоў. Збаўленне праз веру заключаецца ў прызнанні першынства Божага дару, як гэта прадстаўляе св. Павел: «Бо ласкаю вы збаўлены праз веру. І гэта не ад вас, гэта Божы дар» ( 2, 8).

20. Новая логіка веры сканцэнтравана на Хрысце. Вера ў Хрыста збаўляе нас, бо менавіта ў Ім жыццё радыкальна адкрываецца на Любоў, якая апярэджвае нас і перамяняе нас знутры, дзейнічае ў нас і з намі. Гэта выразна бачна ў прадстаўленай Апосталам Народаў эгзэгезе

тэксту з Кнігі Другазаконня, эгзэгезе, якая ўпісваецца ў найглыбейшую дынаміку Старога Запавету. Майсей кажа народу, што загады Бога не празмерна высокія і не празмерна далёкія ад чалавека. Не трэба казаць: «Хто ж <...> узыдзе ў неба і прынясе іх нам?» ці: «Хто ж пойдзе за мора і прынясе іх нам?» (пар.  30, 11-14). Св. Павел раз'ясняе гэтую блізкасць Божага слова як тое, што звязана з прысутнасцю Хрыста ў хрысціяніне. «Не кажы ў сэрцы тваім: "Хто ўзыдзе на неба?", каб Хрыста прывесці, або: "Хто сыдзе ў адхлань?", каб Хрыста ўзняць з мёртвых» ( 10, 6-7). Хрыстус зышоў на зямлю і ўваскрос; праз сваё Уцелаўленне і Уваскрасенне Божы Сын прайшоў увесь шлях чалавека і жыве ў нашых сэрцах праз Духа Святога. Вера ведае, што Бог стаў для нас вельмі блізкім, што Хрыстус быў дадзены нам як вялікі дар, які ўнутрана перамяняе нас, які жыве ў нас і праз гэта адорвае нас святлом, якое асвятляе пачатак і канец жыцця, увесь шлях чалавека.

21. Дзякуючы гэтаму можам зразумець навізну, да якой вядзе нас вера. Веруючы чалавек перамяняецца Любоўю, на якую адкрыўся ў веры, а калі адкрываецца на гэтую ахвяраваную яму Любоў, яго існаванне выходзіць па-за яго межы. Таму св. Павел можа сказаць: «І ўжо не я жыву, а жыве ўва мне Хрыстус» ( 2, 20) і заклікаць: «…каб праз веру Хрыстус пасяліўся ў сэрцах вашых» ( 3, 17). У веры пашыраецца «я» веруючага, каб пасяліўся ў ім хтосьці Іншы, каб ён жыў у кімсьці Іншым, і такім чынам яго жыццё пашыраецца ў Любові. Тут мае месца менавіта дзеянне Духа Святога. Хрысціянін можа мець вочы Езуса, Яго пачуцці, Яго сыноўскую гатоўнасць, бо яму дадзены ўдзел у Яго Любові, якой ёсць Дух. І ў гэтай Любові набываецца пэўным чынам позірк, уласцівы Езусу. Без гэтага прыпадабнення ў Любові, без прысутнасці Духа, які вылівае яе ў нашыя сэрцы (пар.  5, 5), немагчыма вызнаваць Езуса як Пана (пар. *1*  12, 3).

## Эклезіяльнае вымярэнне веры

22. Такім чынам жыццё з веры становіцца эклезіяльным жыццём. Калі св. Павел кажа хрысціянам у Рыме пра адно цела, якое ствараюць у Хрысце ўсе веруючыя, ён заклікае, каб яны не ганарыліся; бо кожны павінен ацэньваць сябе «паводле веры, удзеленай кожнаму Богам» ( 12, 3). Веруючы вучыцца глядзець на самога сябе паводле вызнаванай веры. Постаць Хрыста – гэта люстэрка, у якім ён адкрывае свой вобраз. А паколькі Хрыстус заключае ў сабе ўсіх веруючых, якія ўтвараюць Яго цела, хрысціянін разумее сябе ў гэтым целе, у першасных адносінах да Хрыста і да братоў па веры. Вобраз цела не зводзіць веруючага да простай ананімнай часткі цэлага, да звычайнага элемента вялікага механізма, але больш падкрэслівае жыццёвую сувязь Хрыста з веруючымі і ўсіх веруючых паміж сабою (пар.  12, 4-5). Хрысціяне ўтвараюць «адно» (пар.  3, 28), не губляючы сваёй індывідуальнасці, а ў служэнні іншым кожны атрымлівае да канца ўласнае жыццё. Становіцца зразумелым, чаму па-за целам, па-за гэтай еднасцю Касцёла ў Хрысце, па-за Касцёлам, які – згодна са словамі Рамана Гуардзіні – «з'яўляецца гістарычным носьбітам

поўнага позірку Хрыста на свет» [16] , вера губляе сваю меру, не знаходзіць ужо сваёй раўнавагі, дастатковай прасторы, каб утрымацца. Вера па неабходнасці мае эклезіяльную форму, вызнаецца знутры цела Хрыста як канкрэтная камунія веруючых. Менавіта з гэтай касцёльнай прасторы яна адкрывае кожнага хрысціяні-на на ўсіх людзей. Пачутае слова Хрыста моцаю свайго дынамізму перамяняецца ў хрысціяніне ў адказ і становіцца ў сваю чаргу словам сказаным, вызнаннем веры. Св. Павел сцвярджае: «<…> сэрцам верацъ для апраўдання, а вуснамі вызнаюць для збаўлення» ( 10, 10). Вера – гэта не прыватная справа, не індывідуалісцкае паняцце, не суб’ектыўнае меркаванне, яна нараджаецца са слухання і прызначана стаць выказваннем, абвяшчэннем. «Як жа будуць заклікаць таго, у каго не паверылі? Як будуць слухаць, калі няма каму абвяшчаць?» ( 10, 14). Вера дзейнічае ў хрысціяніне, пачынаючы ад прынятага дару, ад Любові, якая вядзе да Хрыста (пар.  5, 6), і робіць яго ўдзельнікам дарогі Касцёла, які пілігрымуе ў гісторыі да свайго спаўнення. Перамененаму такім чынам чалавеку адкрываецца новы спосаб бачання, вера становіцца святлом для яго вачэй.

## РАЗДЗЕЛ II

## КАЛІ НЕ ПАВЕРЫЦЕ, НЕ ЗРАЗУМЕЕЦЕ
(пар. 7, 9)

### Вера і праўда

23. Калі не паверыце, не зразумееце. Так тлумачацца словы Ісаі, скіраваныя да караля Ахаза ў грэцкай версіі габрэйскай Бібліі, у перакладзе Сэптуагінты, здзейсненым у Александрыі ў Егіпце. Вось так справа пазнання праўды была пастаўлена ў цэнтры веры. Аднак у габрэйскім тэксце знаходзім штосьці іншае. У ім прарок кажа каралю: «Калі не паверыце, не ўстаіце». Маем тут гульню словаў з дзвюма формамі дзеяслова *’ama$n*: «паверыце» (*ta’amînû*) і «ўстаіце» (*te$’a$me$nû*). Кароль, напа-лоханы магутнасцю сваіх ворагаў, шукае бяспекі, якую можа яму гарантаваць дамова з вялікай Асірыйскай імперыяй. У гэты час прарок заклікае яго, каб ён спадзяваўся толькі на сапраўдную скалу, якая не вагаецца, – на Бога Ізраэля. Паколькі Бог праўдзівы, разумна будзе верыць у Яго, будаваць сваю бяспеку на Яго слове. Гэтага Бога Ісая крыху пазней назаве два разы «Богам-Амэн» (пар. 65, 16), непарушным фундаментам вернасці запавету. Можна меркаваць, што ў грэцкай версіі Бібліі, перакладаючы «ўстаяць» як «зразумець», зроблена значная змена тэксту праз адыход ад біблійнага разумення паняцця даверу Богу да грэцкага паняцця разумення. Аднак гэты прыклад, які напэўна дапускае дыялог з грэцкай культурай, не адыходзіць ад глыбокай дынамікі габрэйскага тэксту. Апора, якую Ісая абяцае каралю, звязана з разуменнем дзеяння Бога і з еднасцю, якую Ён надае жыццю чалавека і гісторыі народу. Прарок заклікае да зразумення шляхоў Пана, каб у вернасці Бога ад-крыць мудры намер, які кіруе стагоддзямі. Св. Аўгустын змясціў у сваіх «Вызнаннях» сінтэз слоў «зразумець» і «ўстаяць», калі сказаў аб праўдзе, якой можна паверыць, каб моцна стаяць: «Тады падужэю і ўмацуюся ў Табе, <…> у Тваёй праўдзе» [17] . З кантэксту ведаем, што св. Аўгустын хоча паказаць, якім чынам гэтая верагодная Божая праўда – як сведчыць пра гэта Біблія – з’яўляецца Яго вернай прысутнасцю ў гісторыі, Яго здольнасцю з’яднаць разам час і сабраць у адно раскіданыя чалавечыя дні [18] .

24. Прачытаны ў гэтым святле тэкст Ісаі вядзе да наступнай высновы: чалавеку неабходна пазнанне, неабходна праўда, бо без яе ён не мае апоры, не ідзе наперад. Вера без праўды не збаўляе, не робіць упэўненымі нашыя крокі. Застаецца прыгожай байкай, праекцыяй нашых жаданняў шчасця, чымсьці, што нас задавальвае толькі ў такой ступені, у якой мы хочам паддавацца ілюзіі, або зводзіцца да прыгожага пачуцця, якое дае суцяшэнне і грэе, але залежыць ад зменлівасці нашага духу, зменлівасці часоў і няздольнае падтрымліваць на

пастаяннай дарозе ў жыцці. Калі б такой была вера, кароль Ахаз меў бы прычыну не ставіць у залежнасць ад эмоцыі свайго жыцця і бяспекі свайго каралеўства. Але з увагі на сваю ўнутраную сувязь з праўдай вера можа даць новае святло, пераўзыходзячы разлікі караля, бо яе позірк сягае далей, бо яна разумее дзеянне Бога, вернага свайму запавету і сваім абяцанням.

25. Нагадванне пра сувязь веры з праўдай сёння найбольш неабходна менавіта з прычыны крызісу праўды. У сучаснай культуры часта назіраецца тэндэнцыя прымаць за адзіную праўду тую, якая звязана з тэхнікай: праўдзівае тое, што чалавек можа пабудаваць і змерыць дзякуючы сваім ведам; яно праўдзівае, бо функцыянуе і гэтым робіць жыццё больш выгодным і лёгкім. Сёння толькі гэта здаецца праверанай праўдай, адзінай, якой можна падзяліцца з іншымі, адзінай, аб якой можна дыскутаваць і разам у ёй удзельнічаць. З іншага боку, маглі б існаваць таксама адзінкавыя праўды, якія заключаюцца ў тым, каб быць праўдзівымі адносна таго, што кожны адчувае ў сабе, праўды, важныя толькі для канкрэтнай асобы, якіх нельга прапанаваць іншым, каб яны служылі агульнаму дабру. З падазронасцю ўспрымаецца вялікая праўда, тая, якая тлумачыць усё індывідуальнае і грамадскае жыццё. Паўстае пытанне, ці не такой была праўда, якую распаўсюджвалі вялікія тата-літарныя сістэмы мінулага стагоддзя, праўда, якая навязвала ўласную глабальную канцэпцыю, каб сцерці канкрэтную гісторыю паасобнага чалавека? Таму за-стаецца толькі рэлятывізм, які не цікавіцца ўжо пытаннем аб праўдзе ўсяго, пытаннем, якое ў асноўным з’яўляецца таксама пытаннем пра Бога. У такой перспектыве лагічным з’яўляецца жаданне знішчыць сувязь рэлігіі з праўдай, бо гэтая сувязь была б падставай для фанатызму, што імкнецца знішчыць чалавека, які не падзяляе веры. У гэтым кантэксце можам гаварыць пра вялікі недахоп памяці сучаснага свету. Бо пытанне аб праўдзе з’яўляецца пытаннем аб памяці, глыбокай памяці, бо адносіцца да таго, што нас апярэджвае, і такім чынам можа з’яднаць нас незалежна ад нашага малога і абмежаванага «я». Гэта пытанне пра пачатак усяго, у святле якога можна заўважыць мэту, а таксама сэнс агульнай дарогі.

## Веданне праўды і любові

26. Ці ў гэтай сітуацыі хрысціянская вера можа паслужыць агульнаму дабру ў межах належнага разумення праўды? Каб адказаць на гэтае пытанне, трэба задумацца над відам пазнання, уласцівага веры. У гэтым нам могуць дапамагчы словы св. Паўла: «Бо сэрцам верацъ» ( 10, 10). Паводле Бібліі цэнтрам чалавека з’яўляецца сэрца, у якім сустракаюцца ўсе яго вымярэнні: цела і дух; глыбіня асобы і яе адкрыццё на свет і іншых; розум, воля і пачуцці. Вось жа, калі сэрца здольнае яднаць гэтыя вымярэнні, то дзеецца так таму, што яно з’яўляецца месцам, дзе мы адкрываемся на праўду і любоў і дазваляем, каб яны ў глыбіні закранулі нас і перамянілі. Вера перамяняе ўсю асобу, і настолькі, наколькі яна адкрываецца на любоў. Дзякуючы гэтаму з’яднанню веры і любові можна зразумець форму пазнання, якая

ўлас-ціва веры, яе сілу пераконвання, яе здольнасць асвятляць нашую дарогу. Вера пазнае настолькі, наколькі звязана з любоўю, бо любоў нясе святло. Разуменне веры нараджаецца тады, калі мы прымаем вялікую Божую любоў, якая перамяняе нас і дае нам новыя вочы, каб мы маглі бачыць рэчаіснасць.

27. Вядома, як філосаф Людвік Вітгенштэйн растлумачыў сувязь паміж верай і ўпэўненасцю. Паводле яго вера падобная да досведу закаханасці, які разумеецца як нешта суб’ектыўнае, чаго нельга прапанаваць як праўдзівае для ўсіх [19] . Сучаснаму чалавеку здаецца, што пытанне любові не мае нічога супольнага з праўдай. Любоў сёння разумеецца як досвед, звязаны са светам непастаянных пачуццяў і ўжо не звязаны з праўдай.

Ці гэта сапраўды адэкватнае апісанне любові? Сапраўды, любоў не можа зводзіцца да пачуцця, якое ўзнікае і знікае. Канешне, яна мае сувязь з нашай пачуццёвасцю, але настолькі, каб адкрыць яе на ўмілаваную асобу і такім чынам распачаць дарогу, якая з’яўляецца выйсцем з замкнёнасці ва ўласным «я» і збліжэннем да другой асобы дзеля будавання трывалых адносінаў; любоў імкнецца да еднасці з умілаванай асобай. Такім чынам, бачым, у якім сэнсе любоў патрабуе праўды. Аднак, калі любоў абапіраецца на праўду, яна можа вытрываць у часе, перамагаючы мімалётнасць хвіліны і застаючыся моцнай, каб падтрымліваць супольную дарогу. Калі любоў не суадносіцца з праўдай, яна падлягае зменлівасці пачуццяў і не вытрымлівае выпрабаванняў часу. Сапраўдная ж любоў яднае ўсе вымярэнні нашай асобы і становіцца новым святлом на шляху, які вядзе да вя-лікага і поўнага жыцця. Без праўды любоў не можа даць трывалай сувязі, не можа вывесці нашае «я» з яго адасаблення і вызваліць яго ад недаўгавечнасці, каб будаваць жыццё і прыносіць плён.

Калі любоў патрабуе праўды, то і праўда патрабуе любові. Нельга аддзяляць любові ад праўды. Без любові праўда становіцца зімной, безасабовай, ускладняе жыццё канкрэтнай асобы. Праўда, якую мы шукаем, тая, што надае сэнс нашай дарозе, асвятляе нас, калі мы ахоплены любоўю. Хто любіць, разумее, што любоў – гэта досвед праўды, што гэта яна адкрывае нашыя вочы, каб мы маглі ўбачыць усю рэчаіснасць па-новаму, разам з каханай асобай. У гэтым сэнсе св. Грыгорый Вялікі напісаў, што «*amor ipse notitia est*» – сама любоў з’яўляецца пазнаннем, нясе з сабою новую логіку [20] . Маецца на ўвазе дыялогавы спосаб успрымання свету, які становіцца пазнаннем, што ўдзяляецца іншай асобе, позіркам у перспектыве іншага чалавека і супольным поглядам на ўсё. Вільгельм з Сан-Цьеры ў Сярэднявеччы звяртаецца да гэтай традыцыі, калі каментуе верш з «Песні песняў», у якім умілаваны кажа ўмілаванай: вочы твае як галубкі (пар. 1, 15) [21] . Гэтыя двое вачэй – тлумачыць Вільгельм – гэта веруючы розум і любоў, якія становяцца адным вокам, каб сузіраць Бога, калі інтэлект становіцца «інтэлектам асветленай любові» [22] .

28. Гэтае адкрыццё любові як крыніцы пазнання, якое з’яўляецца першым досведам кожнага чалавека, знаходзіць праўдзівае адлюстраванне ў біблійным разуменні веры. Радуючыся

любові, з якой Бог яго выбраў і ўстанавіў як народ, Ізраэль прыходзіць да разумення еднасці Божага плану, ад пачатку аж да яго спаўнення. Пазнанне веры, паколькі нараджаецца з Божай любові, якая ўстанаўлівае Запавет, з'яўляецца пазнаннем, якое асвятляе дарогу гісторыі. Таму таксама ў Бібліі праўда і вернасць выступаюць разам: праўдзівы Бог ёсць Богам верным, тым, хто здзяйсняе свае абяцанні і дазваляе ў часе разумець свой намер. Праз досвед прарокаў, у болю выгнання і ў надзеі канчатковага вяртання ў святы горад, Ізраэль зразумеў, што Божая праўда выходзіць па-за межы яго гісторыі, ахопліваючы ўсю гісторыю свету, пачынаючы ад стварэння. Пазнанне веры асвятляе не толькі канкрэтную дарогу аднаго народу, але ўсю гісторыю створанага свету, ад яго пачатку аж да канца.

Вера як слуханне і бачанне

29. Зважаючы на тое, што пазнанне веры звязана з Запаветам з верным Богам, які робіць больш цеснай повязь любові з чалавекам і скіроўвае да яго Слова, Біблія прадстаўляе яго як слуханне; асацыіруе яго з пачуццём слыху. Св. Павел выкарыстаў формулу, якая стала кла-січнай: *fides ex auditu* – «вера – ад пачутага» ( 10, 17). Пазнанне, звязанае са словам, заўсёды з'яўляецца асабістым пазнаннем, якое распазнае голас, якое да-бравольна адкрываецца на яго і паслухмяна ідзе за ім. Таму св. Павел кажа пра «паслухмянасць веры» (пар.  1, 5; 16, 26) [23] . Больш за тое, вера – гэта пазнанне, звязанае з ходам часу, якога патрабуе слова, каб быць выказаным: гэта пазнанне, якому вучымся толькі на шляху наследавання. Слуханне дапамагае добра паказаць сувязь паміж пазнаннем і любоўю.

Калі гаварыць пра пазнанне праўды, то слуханне супрацьпастаўляецца часам бачанню, нібыта ўласціваму грэцкай культуры. Калі з аднаго боку святло дапамагае сузіраць цэласнасць, да якой чалавек заўсёды імкнуўся, то з другога боку, гэта быццам бы не пакідае месца для свабоды, бо зыходзіць з неба і даходзіць непасрэдна да вока, не патрабуючы, каб вока адказвала. Больш за тое, святло быццам бы схіляе да статычнага сузірання, без аднясення да канкрэтнага часу, у якім чалавек цешыцца і церпіць. Паводле гэтай канцэпцыі, біблійны падыход да пазнання як бы супрацьпастаўляецца грэцкаму падыходу, які ў пошуку абсалютнага разумення рэчаіснасці звязаў пазнанне з бачаннем.

Аднак жа ясна, што гэтая ўяўная апазіцыя не адпавядае біблійным фактам. Стары Запавет лучыў абодва віды пазнання, бо слуханне Божага слова звязана з жаданнем сузіраць аблічча Бога. Такім чынам стаў магчымым дыялог з эліністычнай культурай, дыялог, які належыць да сутнасці Святога Пісання. Слуханне ўказвае на аса-бістае пакліканне і паслухмянасць, а таксама на факт, што праўда аб'яўляецца ў часе; позірк дае магчымасць поўнасцю ўбачыць усю дарогу і дазваляе ўключыцца ў вялікі Божы план; без гэтага бачання мы мелі б толькі асобныя фрагменты невядомага цэлага.

30. Сувязь паміж бачаннем і слуханнем як прыладамі пазнання веры вельмі выразна бачная ў Евангеллі св. Яна. У чацвёртым Евангеллі верыць азначае слухаць і адначасова бачыць. Слуханне ў веры адбываецца згодна з формай пазнання, уласцівай любові: гэта слуханне асобы, якое адрознівае і распазнае голас Добрага Пастыра (пар. 10, 3-5); гэта слуханне, якое загадвае наследаваць, як у выпадку першых вучняў, якія «пачулі <…> і пайшлі за Езусам» ( 1, 37). З другога боку, вера звязана з бачаннем. Часам бачанне знакаў, якія здзяйсняў Езус, апярэджвае веру, як у выпадку габрэяў, якія пасля ўваскрашэння Лазара «… бачылі, што ўчыніў Езус, і паверылі ў Яго» ( 11, 45). У іншых выпадках менавіта вера вядзе да больш глыбокага бачання: «…Калі будзеш верыць, убачыш славу Божую?» ( 11, 40). Урэшце, вера і бачанне пераплятаюцца: «Хто верыць у Мяне, не ў Мяне верыць, а ў таго, хто паслаў Мяне. І хто бачыць Мяне, бачыць таго, хто паслаў Мяне» ( 12, 44-45). Дзякуючы гэтай лучнасці са слуханнем бачанне становіцца следаваннем за Хрыстом, а вера становіцца дарогай бачання, на якой вочы прызвычайваюцца ўглядацца ўглыб. Такім чынам, у велікодны ранак ад Яна, які, калі было яшчэ цёмна, перад пустым гробам «убачыў і паверыў» ( 20, 8), пераходзім да позірку Марыі Магдалены, якая ўжо бачыць Езуса (пар. 20, 14) і хоча Яго затрымаць, але Езус заахвочвае яе сузіраць Яго на Ягоным шляху да Айца, аж да поўнага вызнання самой Магдалены перад вучнямі: «бачыла Пана» ( 20, 18).

Як можна дасягнуць гэтай еднасці слухання і бачання? Гэта магчыма тады, калі за пункт выйсця прымаем канкрэтную асобу Езуса, якога бачым і слухаем. Ён – Слова, якое сталася целам, хвалу якога мы бачылі (пар. 1, 14). Святло веры – гэта святло Аблічча, у якім мы бачым Айца. Праўда, якую разумее вера, у чацвёртым Евангеллі з’яўляецца аб’яўленнем Айца ў Сыне, у Яго целе, а таксама ў Яго зямных чынах; гэтую праўду можна акрэсліць як «яснеючае жыццё» Езуса [24] . Гэта азначае, што пазнанне веры не заахвочвае нас да бачання толькі ўнутранай праўды. Праўда, якую перад намі ад-крывае вера, з’яўляецца праўдай, сканцэнтраванай на сустрэчы з Хрыстом, на сузіранні Яго жыцця, на заўважанні Яго прысутнасці. У гэтым сэнсе св. Тамаш Аквін- скі кажа пра *oculata fides* Апосталаў – пра веру, якая бачыць! – перад Уваскрослым, якога бачаць у целе [25] . Убачылі ўваскрослага Езуса на ўласныя вочы і паверылі, гэта значыць змаглі пранікнуць углыб таго, што бачылі, каб вызнаць Божага Сына, які сядзіць праваруч Айца.

31. Толькі так, праз Уцелаўленне, праз удзел у нашай чалавечай натуры, адпаведнае пазнанне любові магло дасягнуць паўнаты. Святло любові нараджаецца тады, калі ўзрушана нашае сэрца, і праз гэта мы прымаем унутраную прысутнасць умілаванага ў нас, якая дазваляе нам пазнаць Яго таямніцу. Таму мы разумеем, чаму разам са слуханнем і сузіраннем для св. Яна вера стано-віцца дотыкам, як сцвярджае ён у сваім Першым па-сланні: «Тое, што <…> мы чулі <…>, што бачылі на свае вочы, на што глядзелі і да чаго дакраналіся нашыя рукі» (1, 1). Праз сваё ўцелаўленне і прыйсце Езус дакрануўся да нас, і дакранаецца таксама і сёння праз сакрамэнты. Такім чынам, перамяняючы нашыя сэрцы, Ён дазволіў і надалей дазваляе нам распазнаваць Яго і вызнаваць як Божага Сына. Праз веру і мы можам дакрануцца да Яго і атрымаць моц Яго ласкі. Св. Аўгустын, каментуючы

фрагмент пра жанчыну, якая цярпела ад крывацёку і якая дакранулася да Езуса, каб Ён вылечыў яе, (пар. 8, 45-46), сцвярджае: «Вера – гэта дотык сэрца»[26]. Натоўп ціснецца да Яго, але не датыкаецца да Яго асабовым дотыкам веры, які прызнае Яго таямніцу, тое, што Ён – Сын, які аб'яўляе Айца. Толькі калі прыпадабняемся да Езуса, мы атрымліваем адпаведныя вочы, каб убачыць Яго.

Дыялог паміж вераю і розумам

32. Паколькі хрысціянская вера абвяшчае праўду пра поўную любоў Бога і адкрывае на моц гэтай любові, яна даходзіць да самых глыбіняў досведу кожнага чалавека, які прыходзіць на свет праз любоў і пакліканы да любові, каб трываць у святле. Кіруючыся жаданнем асвятліць усю рэчаіснасць і зыходзячы з Божай любові, аб'яўленай у Езусе, імкнучыся любіць тую самую любоў, першыя хрысціяне знайшлі ў грэцкім свеце, у яго прагненні праўды, адпаведнага партнёра для дыялогу. Сустрэча евангельскага абвяшчэння з філасофскай думкай старажытнага свету была вырашальным памостам для таго, каб Евангелле дайшло да ўсіх народаў і зрабіла магчымым плённы ўзаемаўплыў веры і розуму, што паглыбляўся на працягу стагоддзяў, аж да нашага часу. У сваёй энцыкліцы *Fides et ratio* благаслаўлёны Ян Павел II паказаў, што вера і розум узаемна ўмацоўваюцца[27]. Калі мы знаходзім поўнае святло любові Езуса, мы адкрываем, што ў кожнай нашай любові прысутнічаў промень таго святла, і разумеем, якой была яго канчатковая мэта. Тое, што нашая любоў нясе з сабою святло, дапамагае нам адначасова заўважыць дарогу любо-ві да паўнаты абсалютнага ахвяравання для нас Божага Сына. У гэтым двухбаковым суаднясенні святло веры асвятляе ўсе нашыя чалавечыя адносіны, якія можам перажываць у еднасці з любоўю і чуласцю Хрыста.

33. У жыцці св. Аўгустына бачым важны прыклад гэтай дарогі, на якой пошукі розуму, з яго прагаю праўды і яснасці, былі ўключаны ў гарызонт веры, дзякуючы якой набылі новае разуменне. З аднаго боку, ён прымае грэцкую філасофію святла, якая ставіць націск на бачанні. Праз сустрэчу з неаплатанізмам ён пазнаў парадыгму святла, якое зыходзіць з вышыняў, каб асвятліць рэчы, і таму яно лічылася сімвалам Бога. Св. Аўгустын зразумеў Боскую трансцэндэнцыю і адкрыў, што ўсе рэчы маюць сваю празрыстасць, і таму могуць адлюстроўваць дабрыню Бога, Дабро. Гэтым ён вызваліўся ад маніхейства, у якім трываў раней і пад уплывам якога думаў, што зло і дабро няспынна змагаюцца паміж сабою, змешваючыся і расплываючыся без выразных межаў. Разуменне, што Бог ёсць святлом, дало яго жыццю новы напрамак, здольнасць распазнаць зло, якое ўчыніў, і вярнуцца да дабра.

З іншага боку, у канкрэтным вопыце св. Аўгустына, пра што ён сам расказвае ў сваёй «Споведзі», вырашальным момантам на яго шляху веры было не бачанне Бога па-за гэтым

святлом, а больш слуханне, калі ў садзе ён пачуў голас, які казаў: «Вазьмі і чытай»; узяў ён у рукі кнігу Пасланняў св. Паўла і затрымаўся на 13 раздзеле Паслання да Рымлянаў [28] . Так з'явіцца асабовы Бог Бібліі, які можа гаварыць з чалавекам, сысці і жыць з ім, а таксама спадарожнічаць яму на дарогах гісторыі, аб'яўляючыся падчас слухання і адказу.

Аднак гэтая сустрэча з Богам Слова не прывяла св. Аўгустына да адкідвання святла і бачання. Ён спалучыў абедзве перспектывы, кіруючыся аб'яўленнем любові Бога ў Езусе. Распрацаваў філасофію святла, якая прымае ўласцівую слову ўзаемнасць і дазваляе свабодна глядзець у напрамку святла. І як на слова гучыць свабодны адказ, так і святло знаходзіць у якасці адказу вобраз, які адлюстроўвае яго. Яднаючы слуханне і бачанне, св. Аўгустын можа казаць пра «слова, якое яснее ўнутры чалавека» [29] . Такім чынам святло становіцца як бы святлом слова, бо з'яўляецца святлом асабовага Аблічча, святлом, якое асвятляе, заклікае нас і прагне адлюс--троўвацца на нашым абліччы, каб выпраменьваць з нашага сэрца. Дарэчы, прага поўнага бачання, а не толькі фрагментаў гісторыі, надалей ёсць і заспакоіцца ў канцы, калі чалавек – як кажа святы з Гіпоны – бу-дзе бачыць і любіць [30] . І гэта не таму, што будзе здольным атрымаць усё святло, якое заўсёды будзе невычарпальным, але таму, што ўвесь увойдзе ў святло.

34. Святло любові, уласцівае веры, можа раз'ясніць пытанні наконт праўды, якія задаюцца ў наш час. Сёння праўда часта зводзіцца да суб'ектыўнай аўтэнтычнасці чалавека, датычыць індывідуальнага жыцця. Агульная праўда абуджае ў нас страх, бо мы атаясамліваем яе з бязлітаснымі загадамі таталітарных сістэм. Аднак, калі праўда з'яўляецца праўдай любові, калі з'яўляецца праўдай, якая адкрываецца ў асабовай сустрэчы з Іншым і з іншымі, яна вызваляецца ад замкнёнасці асобы і можа быць часткай агульнага дабра. Будучы праўдай любові, яна не з'яўляецца праўдай, якая навязваецца сілаю, і не знішчае асобу. Узнікаючы з любові, яна можа дайсці да сэрца, да цэнтра асобы кожнага чалавека. Адсюль выразна вынікае, што вера не з'яўляецца бязлітаснай, але ўзрастае ў сумесным жыцці, у пазнанні іншага чалавека. Вернік не мае нахабнасці; наадварот, праўда дае яму пакору, бо ён ведае, што гэта не мы яе маем, але гэта яна атрымлівае нас. Не ствараючы штучных паставаў, упэўненасць веры загадвае нам вырушыць у дарогу і дае магчымасць даваць сведчанне і весці дыялог з усімі.

З іншага боку, для святла веры, паколькі яно звязана з праўдай любові, не чужы матэрыяльны свет, бо любоў заўсёды перажываецца ў целе і душы; святло веры – гэта ўцелаўлёнае святло, крыніца якога ў светлым жыцці Езуса. Яно асвятляе таксама матэрыю, давярае яе ладу, ведае, што ў ёй адкрываецца больш шырокая дарога гармоніі і зразумення.

Праз гэта вера дабратворна ўплывае на погляды навукі: яна запрашае вучонага адкрыцца на рэчаіснасць з усім яе невычарпальным багаццем. Вера абуджае крытычнае разуменне, бо не дазваляе, каб доследы задавольваліся толькі формуламі, і дапамагае зразумець, што

прырода заўсёды большая за іх. Заахвочваючы да захаплення таямніцай стварэння, вера пашырае гарызонты розуму, каб лепш асвятліць свет, які адкрываецца перад навуковымі доследамі.

Вера і пошукі Бога

35. Святло веры ў Езуса асвятляе таксама ўсіх, хто шукае Бога, і робіць свой хрысціянскі ўклад у дыялог з вызнаўцамі розных рэлігій. Пасланне да Габрэяў кажа пра сведчанне справядлівых, якія ўжо перад Запаветам з Абрагамам з вераю шукалі Бога. Пра Эноха гаворыцца, што «было засведчана яму, што ён спадабаўся Богу» ( 11, 5), а гэта немагчыма без веры, бо «той, хто падыходзіць да Бога, павінен верыць, што Ён існуе і дае ўзнагароду тым, хто Яго шукае» ( 11, 6). Таму можна зразумець, што шлях пабожнага чалавека вядзе праз вызнанне веры ў Бога, які клапоціцца пра яго і якога можна знайсці. Якую ж іншую ўзнагароду Бог мог бы даць тым, хто шукае Яго, калі не сустрэчу з Ім? Яшчэ раней бачым постаць Абэля. Яго вера таксама ўсхваляецца, і з-за яе Богу спадабаліся яго дары, ахвяра з першароднай жывёлы (пар. 11, 4). Пабожны чалавек стараецца распазнаць Божыя знакі ў сваім штодзённым жыцці, у змене пораў году, ва ўраджайнасці зямлі і ва ўсім руху космасу. Бог ёсць святлом, і Яго можа сустрэць таксама той, хто Яго шукае шчырым сэрцам.

Вобразам гэтага пошуку з’яўляюцца Мудрацы, якіх вяла зорка аж да Бэтлеема (пар. 2, 1-12). Божае святло паказала ім шлях, як зорка, што свеціць на шляху, які вядзе да адкрыццяў. Таму зорка кажа пра цярплівасць Бога да нашых вачэй, якія павінны прызвычаіцца да Яго бляску. Пабожны чалавек знаходзіцца ў дарозе і павінен быць гатовым дазволіць весці сябе, выйсці па-за свае межы, каб знайсці Бога, які заўсёды здзіўляе. Гэтая павага Бога да вачэй чалавека паказвае нам, што, калі чалавек набліжаецца да Яго, чалавечае святло не знікае ў яснеючай бязмежнасці Бога, як зорка, што гасне на світанні, але становіцца тым больш яркай, чым больш збліжаецца да першаснага агню, як люстэрка, што адбі-вае святло. Хрысціянскае вызнанне веры ў Езуса, адзінага Збаўцу, сцвярджае, што ўсё Божае святло сканцэнтравана ў Ім, у Яго «яснеючым жыцці», у якім адкрываюцца пачатак і канец гісторыі [31] . Няма ніводнага чалавечага досведу, ніводнай дарогі чалавека да Бога, якую не магло б прыняць гэтае святло, асвятліць і ачысціць. Чым больш хрысціянін заглыбляецца ў круг, адкрыты Хрыстовым святлом, тым больш становіцца здольным зразумець і спадарожнічаць кожнаму чалавеку на шляху да Бога.

З увагі на тое, што вера падобная да дарогі, яна датычыць таксама жыцця людзей, якія хоць і не вераць, але прагнуць верыць і не перастаюць шукаць. У такой ступені, у якой яны адкрываюцца шчырым сэрцам на любоў і вырушаюць у дарогу з гэтым святлом, якое здольныя заўважыць, ужо жывуць – не ведаючы пра гэта – на шляху да веры. Імкнуцца дзейнічаць так, як бы Бог існаваў, часам таму, што Ён неабходны, каб знайсці трывалае

суаднясенне ў супольным жыцці, або таму, што адчуваюць прагу святла сярод змроку, або таксама таму, што, заўважаючы, якім вялікім і прыгожым ёсць жыццё, інтуітыўна адчуваюць, што прысутнасць Бога зрабіла б яго яшчэ большым. Св. Ірэнэй з Ліёна расказвае, што Абрагам, перш чым пачуў голас Бога, ужо шукаў Яго «ў гарачым прагненні свайго сэрца» і «перамерваў увесь свет, пытаючыся, дзе ёсць Бог», аж нарэшце «Бог злітаваўся над тым, які сам шукаў Яго ў маўчанні» [32] . Хто вырушае ў дарогу, каб рабіць дабро, ужо збліжаецца да Бога, ужо атрымлівае Яго дапамогу, бо гэта менавіта моц Божага святла асвятляе нашыя вочы, калі мы ідзём да паўнаты любові.

## Вера і тэалогія

36. Паколькі вера з’яўляецца святлом, яна заклікае нас паглыбіцца ў яе, штораз больш даследаваць асветлены ёю гарызонт, каб лепш пазнаць тое, што мы любім. З гэтага жадання нараджаецца хрысціянская тэалогія. Таму зразумела, што тэалогія немагчыма без веры і што яна належыць да дынамікі веры, якая імкнецца да больш глыбокага разумення аб’яўлення Бога, кульмінацыяй якога з’яўляецца таямніца Хрыста. Першым вынікам ёсць тое, што ў тэалогіі не ўлічваецца толькі высілак розуму, каб даследаваць і пазнаць, як у эксперыментальных навуках. Бога нельга звесці да прадмету. Ён – Аб’ект, які дазваляе сябе пазнаць і аб’яўляецца ў адносінах асобы з асобай. Сапраўдная вера скіроўвае розум да адкрыцця на святло, якое паходзіць ад Бога, каб, кіруючыся любоўю да праўды, ён мог больш глыбока пазнаваць Бога. Вялікія доктары і тэолагі Сярэднявечча сцвярджалі, што тэалогія як навука пра веру з’яўляецца ўдзелам у пазнанні Бога так, як Ён ведае сябе. Таму тэалогія – гэта не толькі слова пра Бога, але перадусім прыняцце і імкненне да больш глыбокага зразумення таго слова, якое кіруе да нас Бог, слова, якое Бог кажа пра сябе, бо з’яўляецца спрадвечным дыялогам камуніі і дапускае чалавека да гэтага дыялогу [33] . Таму рысай тэалогіі з’яўляецца пакора, яна дазваляе «дакрануцца» да Бога, прызнае сваю абмежаванасць перад Таямніцай і стараецца даследаваць невымернае багацце гэтай Таямніцы ўласцівымі розуму спосабамі.

Больш за тое, тэалогія прымае эклезіяльную форму веры; яе святло – гэта святло веруючага аб’екта, якім ёсць Касцёл. З аднаго боку, гэта азначае, што тэалогія павінна служыць веры хрысціянаў, пакорна сцерагчы і паглыбляць веру ўсіх, асабліва самых простых людзей. Больш за тое, паколькі тэалогія жыве вераю, Навучанне Папы і з’яднаных з ім біскупаў не лічыць чымсьці знешнім, абмежаваннем сваёй свабоды, але наадварот, адным са сваіх унутраных элементаў, арганізуючым, бо Навучанне гарантуе кантакт з першаснай крыніцай і дае ўпэўненасць, што чэрпае са Слова Хрыста ў яго поўні.

## РАЗДЗЕЛ III

## ПЕРАДАЮ ВАМ ТОЕ, ШТО ПРЫНЯЎ
(пар. *1* 15, 3)

### Касцёл, маці нашай веры

37. Той, хто адкрыўся на любоў Бога, пачуў Яго голас і атрымаў Яго святло, не можа затрымаць гэтага дару для сябе. Паколькі вера – гэта слуханне і бачанне, то перадаецца яна таксама як слова і як святло. Прамаўляючы да Карынцянаў, апостал Павел выкарыстаў менавіта гэтыя два вобразы. З аднаго боку, кажа: «Маючы той самы дух веры, як напісана: “ , ”, – і мы верым, таму і кажам» (*2* 4, 13). Прынятае слова становіцца адказам, вызнаннем і такім чынам гучыць для іншых, заахвочвае іх паверыць. З другога боку, св. Павел кажа таксама пра святло: «А мы ўсе з адкрытым абліччам углядаемся, нібы ў люстра, у славу Пана і перамяняемся ў той самы вобраз ад славы ў славу…» (*2* 3, 18). Адлюстраванне гэтага святла пераносіцца з аднаго аблічча на другое, так, як Майсей насіў у сабе адлюстраванне Божай хвалы пасля размовы з Ім: «Бог <…> засвяціў у нашых сэрцах, каб даць святло пазнання славы Божай у абліччы Езуса Хрыста» (*2* 4, 6). Святло Езуса яснее, як у люстэрку, на абліччы хрысціянаў і так разыходзіцца і даходзіць да нас, каб мы таксама мелі ўдзел у гэтым бачанні і неслі іншым Яго святло, так, як святло пасхала, якое ў пасхальнай літургіі запальвае столькі іншых свечак. Вера перадаецца, можна сказаць, ад асобы да асобы, так, як полымя запальваецца ад іншага агню. Хрысціяне ў сваім убостве сеюць такое ўраджайнае зерне, што яно становіцца вялікім дрэвам, здольным напаўняць свет пладамі.

38. Перадаванне веры, якая яснее для ўсіх людзей у кожным кутку, адбываецца таксама ў часе, з пакалення ў пакаленне. Паколькі вера нараджаецца з сустрэчы, якая адбываецца ў гісторыі, і асвятляе нашую даро-гу ў часе, яна павінна перадавацца праз вякі. Менавіта дзякуючы непарыўнаму ланцугу сведчанняў даходзіць да нас аблічча Езуса. Як гэта магчыма? Як мы можам быць упэўненымі, што праз вякі мы даходзім да «праўдзівага Езуса»? Калі б чалавек быў адасобленым, калі б мы ўзялі за пункт выйсця толькі адзінкавае «я», якое прагне ў самім сабе мець перакананне ў сваім пазнанні, то ўпэўненасць была б немагчымай. Я не магу сам убачыць таго, што здарылася ў настолькі аддаленую ад мяне эпоху. Аднак гэта не адзіны спосаб, якім чалавек пазнае. Асоба заўсёды жыве ў суадносінах. Паходзіць ад іншых, належыць іншым, яе жыццё становіцца большым у сустрэчы з іншымі. Таксама самапазнанне, уласнае самаўсведамленне мае характар суадносінаў і звязана з тымі, хто быў перад намі: найперш з нашымі бацькамі, якія далі нам жыццё і імя. Сама мова, словы, якімі мы інтэрпрэтуем нашае жыццё і нашую рэчаіснасць, даходзяць да нас праз іншых, захоўваюцца ў жывой памяці іншых. Самапазнанне магчыма толькі тады, калі мы

маем доступ да большай памяці. Дзеецца так і з верай, якая прыводзіць да паўнаты чалавечы спосаб разумення. Будучыня веры, справа любові Езуса, якая распачала ў свеце новае жыццё, даходзіць да нас у памяці іншых, сведкаў, захоўваецца і жыве ў тым адзіным суб’екце памяці, якім з’яўляецца Касцёл. Касцёл – гэта маці, якая вучыць нас гаварыць моваю веры. Св. Ян падкрэслівае гэты аспект у сваім Евангеллі, яднаючы з сабою веру і памяць, а таксама звязваючы іх з дзеяннем Духа Святога, які – як кажа Езус – «нагадае вам пра ўсё» ( 14, 26). Любоў, якой з’яўляецца Дух і якая трывае ў Касцёле, яднае з сабою ўсе эпохі і робіць нас сучаснікамі Езуса, становячыся праз гэта нашым правадыром на шляху веры.

39. Нельга верыць у самоце. Вера не з’яўляецца толькі індывідуальным выбарам веруючага, гэта не ізаляваныя адносіны паміж «я» верніка і «Ты» Бога, паміж аўтаномным суб’ектам і Богам. Па сваёй натуры яна адкрываецца на «мы», заўсёды рэалізуецца ў супольнасці Касцёла. Нагадвае нам пра дыялогавую форму *Credo* ў літургіі хросту. Вера выяўляецца як адказ на запрашэнне, на слова, якое трэба слухаць і якое не паходзіць ад мяне, і таму ўключаецца ў дыялог, не можа быць толькі вызнаннем, якое выходзіць ад асобы. Можна адказаць у першай асобе «веру» толькі таму, што ёсць прыналежнасць да вялікай супольнасці, толькі таму, што гаворыцца таксама «верым». Гэтая адкрытасць на эклезіяльнае «мы» адбываецца згодна з ад-крытасцю, якая характэрна для Божай любові, якая не з’яўляецца толькі адносінамі паміж Айцом і Сынам, паміж «я» і «ты», але таксама ў Духу ёсць «мы», супольнасць асобаў. Таму той, хто верыць, ніколі не з’яўляецца самотным, і таму вера імкнецца да распаўсюджвання, каб запрасіць іншых да сваёй радасці. Чалавек, які атрымлівае веру, бачыць, што пашыраецца яго «я» і ўстанаўліваюцца новыя адносіны, якія ўзбагачаюць жыццё. Тэртуліян добра перадаў гэта, калі сказаў пра катэхумэна, што «пасля абмыцця новага нараджэння» ён прымаецца ў дом Маці, каб узнесці рукі і разам з братамі маліцца , будучы прынятым у новай сям’і [34] .

Сакрамэнты і перадаванне веры

40. Як кожная сям’я, Касцёл перадае сваім дзецям тое, што захоўвае ў сваёй памяці. Што зрабіць, каб нічога не загінула, але – наадварот – усё штораз больш паглыблялася ў спадчыне веры? Менавіта дзякуючы Апостальскай Традыцыі, захаванай у Касцёле пад апекай Духа Святога, мы маем жывы кантакт з першаснай памяццю. Тое, што было перададзена Апосталамі – як сцвярджае Другі Ватыканскі Сабор – «ахоплівае ўсё, што спрыяе жыццю Божага народу ў святасці і ўмацаванню яго веры. Так Касцёл трывае ў сваім вучэнні, жыцці і кульце і перадае ўсім пакаленням тое, чым ёсць сам, і тое, ува што верыць» [35] . Вера патрабуе асяроддзя, у якім можна сведчыць пра яе і перадаваць яе, і яно павінна быць адпаведным і прапарцыянальным таму, што перадаецца. Для пераказу толькі дактрынальнага зместу, пэўнай ідэі, быць можа хапіла б кнігі або паўтарэння вуснага

абвяшчэння. Але тое, што перадаецца ў Касцёле, тое, што перадаецца ў яго жывой Традыцыі, ёсць новым святлом, якое нараджаецца у выніку сустрэчы з жывым Богам, святлом, якое дасягае цэнтра асобы, яе сэрца, актывізуючы яе розум, яе волю і яе пачуццёвае жыццё, адкрываючы яе на жывыя адносіны ў камуніі з Богам і іншымі людзьмі. Для пераказу такой поўні існуе спецыяльны сродак, які ахоплівае асобу, цела і дух, нутро і адносіны. Гэтым сродкам з'яўляюцца сакрамэнты, якія здзяйсняюцца ў літургіі Касцёла. У іх перадаецца ўцелаўлёная памяць, звязаная з месцамі і перыядамі жыцця, з'яднаная з усімі пачуццямі; асоба ўключана ў іх як член жывога суб'екта, уключана ў тканку супольніцкіх адносінаў. Таму, калі праўда, што сакрамэнты з'яўляюцца сакрамэнтамі веры [36] , трэба таксама сказаць, што вера мае сакрамэнтальную структуру. Абуджэнне веры лучыцца з абу-джэннем новага сакрамэнтальнага сэнсу жыцця чалавека і хрысціянскай экзістэнцыі, паказваючы, што бачны і матэрыяльны пачатак адкрываюцца на таямніцу таго, што вечнае.

41. Перадаванне веры адбываецца найперш праз хрост. Можа здавацца, што хрост з'яўляецца толькі магчымасцю сімвалічнага вызнання веры, педагагічным актам для асобаў, якія патрабуюць вобразаў і жэстаў, што па сутнасці можна прапусціць. Словы св. Паўла на тэму хросту нагадваюць нам, што гэта не так. Ён сцвярджае, што «праз хрост мы пахаваныя разам з Ім у смерць, каб, як Хрыстус уваскрос з мёртвых дзеля славы Айца, так і нам хадзіць у абноўленым жыцці» ( 6, 4). Праз хрост мы становімся новым стварэннем, усыноўленымі Божымі дзецьмі, удзельнікамі Боскай натуры, членамі Хрыстовага цела. Апостал сцвярджае далей, што хрысціянін падпарадкаваны «форме навучання» (*typos didachés*), якому паслухмяны сэрцам (пар.  6, 17). Чалавек атрымлівае праз хрост таксама вучэнне, якое павінен вызнаваць, а таксама канкрэтную форму жыцця, якая патрабуе ўдзелу ўсёй яго асобы і накіроўвае яго да дабра. Ён пераносіцца ў новае акружэнне, змяшчаецца ў новым асяроддзі, у новым спосабе супольнага дзеяння, у Касцёле. Таму хрост нагадвае нам, што вера не з'яўляецца справаю асобы, якая жыве адасоблена, гэта не акт, які можа здзейсніць чалавек, разлічваючы толькі на ўласныя сілы, але яна павінна быць прынятаю праз уваход у касцёльную супольнасць, якая пераказвае Божы дар: ніхто сам не ўдзяляе сабе хросту, як ніхто не нараджаецца сам для жыцця. Нас ахрысцілі.

42. Якія элементы хросту ўводзяць нас у гэтую новую «форму навучання»? Над катэхумэнам заклікаецца спачатку імя Тройцы: Айца, Сына і Духа Святога. Такім чынам з самага пачатку сцісла паказваецца дарога веры. Бог, які паклікаў Абрагама і хацеў называцца яго Богам; Бог, які аб'явіў сваё імя Майсею; Бог, які даў нам свайго Сына і аб'явіў нам цалкам таямніцу свайго Імя, надзяляе ахрышчанага новай сыноўняй сутнасцю. Так адкрываецца сэнс дзеяння, якое адбываецца падчас хросту, – акунанне ў ваду: вада з'яўляецца адначасова сімвалам смерці, які запрашае нас да навяртання свайго «я», каб яно адкрылася на большае «Я», і сімвалам жыцця, улоння, у якім мы адраджаемся, наследуючы Хрыста ў Яго новай экзістэнцыі. Так, праз акунанне ў ваду, хрост кажа нам пра ўцелаўлёную структуру веры. Дзеянне Хрыста закранае нас у нашай асабовай рэчаіснасці, радыкальна перамяняе нас, і мы становімся ўсыноўленымі Божымі дзецьмі, удзельнікамі Яго

Боскай натуры; мадыфікуе такім чынам усе нашыя адносіны, нашую канкрэтную сітуацыю ў свеце і сусвеце, адкрываючы яе на жыццё ў камуніі. Гэтая дынаміка перамены адзначае хрост, дапамагае нам зразумець важнасць катэхумэнату, які сёння, таксама ў грамадствах са старажытнымі хрысціянскімі каранямі, дзе ўзрастае лічба дарослых, якія прыступаюць да сакрамэнту хросту, набывае асаблівае значэнне для новай евангелізацыі. Гэта дарога падрыхтоўкі да хросту, да перамены ўсяго жыцця ў Хрысце.

У зразуменні сувязі паміж хростам і вераю можа дапамагчы тэкст прарока Ісаі, які ў старажытнай хрыс-ціянскай літаратуры быў злучаны з хростам: «яго прыбежышча – непрыступныя скалы; <…> і не будзе недахопу вады» ( 33, 16) [37] . Ахрышчаны, уратаваны з водаў смерці, мог стаць на «непрыступнай скале», бо знайшоў дапамогу, на якую мог абаперціся. І так вада смерці перамянілася ў ваду жыцця. Грэцкі тэкст апісвае яе як ваду *pists*, ваду «верную». Вада хросту верная, бо ёй можна даверыцца, бо яе струмень далучае да дынамікі любові Езуса, крыніцы ўпэўненасці для нашай дарогі жыцця.

43. Структура хросту прадстаўляе яго як адраджэнне, у якім мы атрымліваем новае імя і новае жыццё, дапамагае нам зразумець сэнс і важнасць хросту дзяцей. Дзіця няздольнае да свабоднага акту прыняцця веры, не можа яшчэ само вызнаваць яе, таму ад яго імя вызнаюць веру яго бацькі і хросныя. Вера перажываецца ў межах супольнасці Касцёла, яна ўпісана ў супольнае «мы». Таму дзіця можа падтрымлівацца іншымі, бацькамі і хроснымі, і можа быць далучана да іх веры, якая з’яўляецца вераю Касцёла і якую сімвалізуе святло, што бацька запальвае ад пасхала падчас літургіі хросту. Гэтая структура хросту падкрэслівае важнасць сумеснага дзеяння Касцёла і сям’і ў перадаванні веры. Як сказаў св. Аўгустын, бацькі пакліканы не толькі даваць жыццё дзецям, але таксама весці іх да Бога, каб праз хрост яны адрадзіліся як Божыя дзеці і атрымалі дар веры [38] . Так разам з жыццём яны адпаведна накіроўваюцца, а таксама атрымліваюць упэўненасць у добрай будучыні; і гэтая накіраванасць затым будзе пацверджана ў сакрамэнце канфірмацыі асаб-лівым знакам Духа Святога.

44. Сакрамэнтальная прырода веры мае сваё найбольшае праяўленне ў Эўхарыстыі. Гэта каштоўны спажытак для веры, гэта сустрэча з Хрыстом, рэальна прысутным праз найвышэйшы акт любові, гэта дар самога сябе, які нараджае жыццё. У Эўхарыстыі перакры-жоўваюцца дзве восі, на якіх трымаецца вера. З аднаго боку – вось гісторыі: Эўхарыстыя – гэта акт памяці, актуалізацыя таямніцы, у якой мінулае, як факт смерці і ўваскрасення, паказвае сваю здольнасць адкрыцца на будучае, прадугадаць канчатковую паўнату. Літургія нагадвае нам пра гэта ў сваім *hodie* – «сёння» таямніц збаўлення. З другога боку – вось паміж бачным светам і нябачным. У Эўхарыстыі мы вучымся заўважаць глыбіню рэчаіснасці. Хлеб і віно перамяняюцца ў Цела і Кроў Хрыста, які становіцца прысутным на сваёй пасхальнай дарозе да Айца: гэты дынамізм уводзіць нас з целам і душою ў імкненне ўсяго стварэння да сваёй паўнаты ў Богу.

45. Здзяйсняючы сакрамэнты, Касцёл перадае сваю памяць, асабліва праз вызнанне веры. Тут маецца на ўвазе не столькі прыняцце збору абстрактных праўд. Наадварот, у вызнанні веры ўсё жыццё накіроўваецца да поўнай еднасці з жывым Богам. Можна сказаць, што праз *Credo* веруючы чалавек пакліканы паглыбіцца ў вызнаваную таямніцу і дазволіць, каб яго перамяніла тое, што ён вызнае. Каб зразумець сэнс гэтых слоў, паразважаем найперш пра змест *Credo*. Яно мае трынітарную структуру: Айцец і Сын яднаюцца ў Духу любові. Такім чынам веруючы сцвярджае, што цэнтрам існавання, найглыбейшай таямніцай усяго з'яўляецца Боская камунія. Больш за тое, *Credo* змяшчае таксама хрысталагічнае вызнанне: пералічваюцца таямніцы жыцця Езуса аж да Яго Смерці, Уваскрасення і Унеба-ўшэсця, у чаканні Яго апошняга прыйсця ў хвале. Таму гаворыцца, што гэты Бог-камунія, узаемнае адорванне любоўю Айца і Сына ў Духу, здольны ахапіць гісторыю чалавека, увесці яго ў сваю дынаміку камуніі, якая мае свой пачатак і канчатковую мэту ў Айцу. Вызнаючы веру, чалавек заўважае, што ўдзельнічае ў праўдзе, якую вызнае. Ён не можа шчыра вымаўляць словы *Credo*, калі не будзе пераменены, не ўвойдзе ў гісторыю любові, якая ахоплівае яго, пашырае яго існаванне і робіць яго часткай вялікай супольнасці, канчатковага суб'екта, які вымаўляе *Credo* і якім з'яўляецца Касцёл. Усе праўды, якія мы вызнаём, гавораць пра таямніцу новага жыцця веры як дарогі камуніі з жывым Богам.

Вера, малітва і Дэкалог

46. Два іншыя элементы з'яўляюцца важнымі для вернага перадавання памяці Касцёла. Першы – гэта малітва Панская, . У ёй хрысціянін вучыцца падзяляць духоўны вопыт самога Хрыста і пачынае бачыць вачыма Хрыста. Пачынаючы ад Таго, хто з'яўляецца Святлом ад Святла, ад Адзінароднага Сына Айца, таксама і мы пазнаем Бога і можам распальваць у іншых прагу наблізіцца да Яго.

Важнай таксама з'яўляецца сувязь паміж верай і Дэкалогам. Як ужо сказалі, вера – гэта дарога, шлях, які трэба прайсці і які пачынаецца з сустрэчы з жывым Богам. Таму ў святле веры, абсалютнага даверу да Бога, які збаўляе, Дэкалог набывае сваю найглыбейшую праўду, што змяшчаецца ва ўступных словах дзесяці запаведзяў: «Я – Пан Бог твой, які вывеў цябе з зямлі егіпецкай» ( 20, 2). Дэкалог – гэта не збор законаў, ён змяшчае канкрэтныя ўказанні, якія дазваляюць выйсці з пустыні «я», якое з'яўляецца для сябе пунктам суаднясення, замкнёнага ў сабе, і распачаць дыялог з Богам, дазволіць Яго міласэрнасці ахапіць нас, каб несці Яго міласэрнасць. Так вера вызнае любоў Бога, дазваляе гэтай любові весці сябе, бо яна вядзе да поў-най камуніі з Богам. Дэкалог – гэта дарога ўдзячнасці, адказу на любоў, яна магчыма таму, што праз веру мы адкрыліся на Божую любоў да нас, якая перамяняе. Новым святлом на гэтай дарозе становіцца тое, чаму Езус навучае ў Казанні на гары (пар. *М* 5-7).

Я згадаў пра чатыры элементы, у якіх выяўляецца скарб памяці, якую передае Касцёл: вызнанне веры, цэлебрацыя сакрамэнтаў, дарога Дэкалогу і малітва. Традыцыйна на іх падставе фарміравалася структура катэхезы, уключна з «Катэхізісам Каталіцкага Касцёла», які з’яўляецца асноўнай прыладай непадзельнага дзеяння, праз якое Касцёл пераказвае ўвесь змест веры, «тое, чым ёсць, і тое, ува што верыць» [39] .

Адзінства і цэласнасць веры

47. Адзінства Касцёла ў часе і прасторы звязана з адзінствам веры: «Адно цела і адзін дух, <…> адна вера» ( 4, 4-5). Сёння можа здавацца, што пры супольных намаганнях можна дасягнуць адзінства людзей у любові, ва ўдзеле ў адным тым самым лёсе, у імкненні да агульнай мэты. Але нам вельмі цяжка зразумець адзінства ў той самай праўдзе. Нам здаецца, што гэтае адзінства пярэчыць свабодзе думкі і незалежнасці асобы. Аднак вопыт любові кажа, што мена-віта ў любові магчыма супольнае бачанне, што праз яго мы вучымся глядзець на рэчаіснасць вачыма іншай асобы і што гэта не робіць нас беднымі, але ўзбагачае наш спосаб гледжання. Сапраўдная любоў, паводле меры Божай любові, патрабуе праўды, і праз супольнае патрабаванне праўды, якой ёсць Езус Хрыстус, становіцца трывалай і глыбокай. Гэта таксама радасць веры, адзінства бачання з адной мэтай і ў адным духу. У гэтым сэнсе св. Леў Вялікі мог сцвярджаць: «Калі вера не адна, яна не з’яўляецца верай» [40] .

У чым сакрэт гэтага адзінства? Вера перадусім адна з увагі на адзінства Бога, якога яна ведае і вызнае. Усе праўды веры адносяцца да Яго, з’яўляюцца шляхамі пазнання Яго сутнасці і Яго дзейнасці, таму адзначаюцца найбольшым адзінствам, чым што-небудзь іншае, што можа ахапіць нашае мысленне, маюць еднасць, якая ўзбагачае нас, бо перадаецца нам і робіць з нас адно.

Больш за тое, вера адна, бо адносіцца да аднаго Пана, да жыцця Езуса, да Яго канкрэтнай гісторыі, якую Ён падзяляе з намі. Св. Ірэнэй з Ліёна растлумачыў гэта праз супрацьпастаўленне з ерэтыкамі-гностыкамі. Яны сцвярджалі, што існуюць два віды веры: прымітыўная вера, вера простых людзей, недасканалая, якая застаецца на ўзроўні цела Хрыста і сузірання Яго таямніц; і іншага віду вера, больш глыбокая і дасканалая, са-праўд-ная вера, даступная для вузкага кола ўтаямнічаных, якая дзякуючы інтэлекту ўзносіцца па-над целам Езуса, да таямніц невядомага Боства. Адносна гэтага погляду, які надалей захапляе і мае сваіх прыхільнікаў таксама і ў наш час, св. Ірэнэй сцвярджае, што вера адна, бо датычыць заўсёды канкрэтнага факту Уцелаўлення, не адрываючыся ніколі ад цела і гісторыі Хрыста, бо ў іх Бог хацеў аб’явіцца ў поўні. Таму няма розні-цы ў веры паміж «тым, хто можа гаварыць пра яе больш доўга» і «тым, хто няшмат гаворыць пра яе», паміж тым, хто вышэйшы, і тым, хто менш здольны: ні першы не можа яе павялічыць, ні другі не

можа яе паменшыць [41] .

Урэшце, вера адна, бо вызнае яе ўвесь Касцёл, які з’яўляецца адным целам і адным духам. У камуніі аднаго суб’екта, якім ёсць Касцёл, мы прымаем агульны погляд. Праз вызнанне той самай веры мы абапіраемся на тую самую скалу, пераменьваемся тым самым Духам любові, выпраменьваем адно святло і маем адзін погляд, каб ахапіць рэчаіснасць.

48. Улічваючы тое, што вера адна, яна павінна вызнавацца ва ўсёй яе чыстасці і поўні. Менавіта таму, што ўсе праўды веры лучацца ў адно, непрыняцце якой-небудзь з іх, хоць бы нават той з іх, якія могуць здавацца менш важнымі, прыносіць шкоду цэламу. Кожная эпоха можа прызнаваць пэўныя элементы веры за больш лёгкія або больш цяжкія для прыняцця: таму вельмі важна сачыць, каб перадаваўся ўвесь дэпазіт веры (пар. *1* 6, 20), каб належным чынам падкрэсліваліся ўсе аспекты вызнання веры. Паколькі адзінства веры з’яўляецца адзінствам Касцёла, адыманне чагосьці ад веры азначае адыманне чагосьці ад праўды камуніі. Айцы Касцёла апісвалі веру як адно цела, цела праўды з рознымі членамі, аналагічна з целам Хрыста і з яго працягам у Касцёле [42] . Інтэгральнасць веры звязвалася таксама з вобразам Касцёла-дзевы, з яго вернасцю ў абранніцкай любові да Хрыста; знішчэнне веры азначае знішчэнне камуніі з Панам [43] . Еднасць веры з’яўляецца еднасцю жывога арганізма, як трапна заўважыў бл. Джон Генры Ньюман, калі сярод характэрных рысаў, што ўказваюць на працягласць дактрыны ў часе, называў яе здольнасць яднаць у сабе ўсё, што яна знаходзіць у розных асяродках, у якіх прысутнічае, у розных культурах, з якімі сустракаецца [44] , ачышчаючы ўсё і знаходзячы для гэтага найлепшае праяўленне. Такім чынам вера выяўляецца як універсальная, каталіцкая, бо яе святло ўзмацняецца, каб асвятліць увесь сусвет і ўсю гісторыю.

49. Дзеля служэння адзінству веры і яе інтэгральнаму перадаванню Пан даў Касцёлу дар апостальскай сукцэсіі. Дзякуючы яе пасрэдніцтву існуе гарантыя працяг-ласці памяці Касцёла і становіцца магчымым бяспеч-нае чэрпанне з чыстай крыніцы, з якой нараджаецца вера. Гарантыю лучнасці з крыніцай даюць жывыя асобы, і гэта адпавядае жывой веры, якую перадае Касцёл. Яна абапіраецца на вернасці сведкаў, выбраных Панам для гэтага задання. Таму Настаўніцкі Інстытут Касцёла заўсёды выказвае паслухмянасць першаснаму Слову, на якое абапіраецца вера, і з’яўляецца верагодным, бо давярае Слову, якое слухае, сцеражэ і выкладае [45] . У развітальнай прамове, скіраванай да старэйшых з Эфеза ў Мілеце, якую св. Лука перадае ў Дзеях Апосталаў, св. Павел сведчыць, што выканаў даручанае яму Панам заданне «абвяшчэння <…> усёй волі Божай» (20, 27). Менавіта дзякуючы Настаўніцкаму Інстытуту Касцёла да нас можа дайсці непарушнай гэтая воля, а разам з ёй радасць, што мы можам ажыццявіць яе ў поўні.

# РАЗДЗЕЛ IV

## БОГ ПАДРЫХТАВАЎ IМ ГОРАД
(пар. 11, 16)

### Вера і агульнае дабро

50. Прадстаўляючы гісторыю патрыярхаў і справядлівых Старога Запавету, Пасланне да Габрэяў падкрэс-лівае галоўны аспект іх веры. Яна паказана не толькі як дарога, але таксама як будаванне, падрыхтоўка месца, у якім чалавек можа пасяліцца разам з іншымі. Першым будаўніком з'яўляецца Ной, які ў каўчэгу змог уратаваць сваю сям'ю (пар. 11, 7). Затым Абрагам, пра якога сказана, што з увагі на веру ён жыў у шатрах, чакаючы горада, пабудаванага на моцным фундаменце (пар. 11, 9-10). Таму адносна веры з'яўляецца новы давер, новая ўпэўненасць, якую можа даць толькі Бог. Калі чалавек веры абапіраецца на Бога-Амэн, на Бога вернага (пар. 65, 16) і праз гэта сам становіцца моцным, то можам дадаць, што непарушнасць веры адносіцца таксама да горада, які Бог рыхтуе для чалавека. Вера паказвае, якімі трывалымі могуць быць сувязі паміж людзьмі, калі Бог прысутнічае сярод іх. Гэта не датычыць толькі ўнутранай трываласці, нязменнага пераканання веруючага. Вера асвятляе таксама адносіны паміж людзьмі, бо нараджаецца з любові і кіруецца дынамікай Божай любові. Варты даверу Бог дае людзям варты даверу горад.

51. Менавіта праз сувязь з любоўю (пар. 5, 6) святло веры канкрэтна служыць справядлівасці, шанаванню правоў і спакою. Вера нараджаецца з сустрэчы з першаснай Божай любоўю, у якой выяўляюцца сэнс і дабро нашага жыцця. Яна асвятляецца ў такой ступені, у якой уключаецца ў дынаміку, пачатак якой у гэтай любові, гэта значыць, калі становіцца дарогай, што вядзе да паўнаты любові і да яе практыкавання. Святло веры можа падкрэсліць багацце чалавечых адносінаў, тое, што яны могуць трываць, быць магчымымі, абагачаць супольнае жыццё. Вера не аддаляе ад свету і не з'яўляецца чымсьці адарваным ад канкрэтнага ўдзелу сучасных людзей. Без сапраўднай любові не было б нічога, што сапраўды яднае людзей. Еднасць паміж імі была б магчымай толькі тады, калі б абапіралася на карыслівасць, агульныя інтарэсы, боязь, але не на агульнае дабро жыцця ці на радасць, якую можа абуджаць звычайная прысутнасць іншага чалавека. Вера дазваляе зразумець архітэктуру чалавечых адносінаў, бо бачыць іх глыбокі фундамент і канчатковае прызначэнне ў Богу і ў Яго любові і праз гэта асвятляе майстэрства будавання і служыць агульнаму дабру. Так, вера з'яўляецца дабром для ўсіх, з'яўляецца агульным дабром, яе святло асвятляе не толькі Касцёл, і яна служыць не толькі будаванню вечнага горада ў тым свеце. Яна дапамагае нам будаваць нашыя грамадствы, каб яны імкнуліся да будучыні, якая дае надзею. Пасланне да Габрэяў дае прыклад гэтага, калі сярод людзей веры пералічвае Самуэля і Давіда, якія праз веру «здзяйснялі справядлівасць» (11, 33). Гэтыя словы

датычаць іх справядлівасці ў кіраванні, той мудрасці, якая прыносіць народу спакой (пар. *1* 12, 3-5; *2* 8, 15). Рукі веры ўзносяцца да неба, але робяць гэта падчас будавання горада ў любові на адносінах, асноваю якіх з’яўляецца Божая любоў.

Вера і сям’я

52. Пасланне да Габрэяў, калі кажа пра вандроўку Абрагама да будучага горада, згадвае пра благаслаўленне, якое перадавалася ад бацькоў дзецям (пар. 11, 20-21). Першым асяродкам, у якім вера асвятляе горад людзей, з’яўляецца сям’я. Асабліва маю на ўвазе трывалы саюз мужчыны і жанчыны ў сужэнстве. Узнікае ён з іх любові, якая ёсць знакам і прысутнасцю Божай любові, з прызнання і прыняцця дабра сэксуальнай розніцы, праз што сужэнцы могуць стаць адным целам (пар.  2, 24) і нарадзіць новае жыццё, што з’яўляецца праяўленнем дабрыні Стварыцеля, Яго мудрасці і Яго плану любові. Абапіраючыся на гэтую любоў, мужчына і жанчына могуць абяцаць сабе ўзаемную любоў у жэсце, які ахоплівае ўсё жыццё і нагадвае вельмі шмат рысаў веры. Абяцанне любові назаўсёды становіцца магчымым, калі мы адкрываем большы за нашыя праекты план, які нас падтрымлівае і дазваляе нам ахвяраваць каханай асобе ўсю будучыню. Вера дапамагае таксама зразумець усю глыбіню і багацце нараджэння дзяцей і дапамагае нам прызнаць у ім стваральную любоў, якая дае і даручае нам таямніцу новай асобы. Сара менавіта дзякуючы сваёй веры стала маці, разлічваючы на вернасць Бога Яго абяцанню (пар.  11, 11).

53. У сям’і вера суправаджае ўсе перыяды жыцця, пачынаючы з дзяцінства: дзеці вучацца спадзявацца на любоў сваіх бацькоў. Таму важна, каб бацькі клапаціліся пра супольнае практыкаванне веры ў сям’і, спадарожнічалі дзецям на шляху сталення веры. Асабліва моладзь, якая перажывае такі складаны, насычаны і важны для веры перыяд жыцця, павінна адчуваць блізкасць і клопат сям’і і касцёльнай супольнасці на сваім шляху сталення ў веры. Мы ўсе бачылі, што падчас Сусветных дзён моладзі маладыя людзі выказваюць радасць веры, абавязваюцца жыць паводле веры штораз больш трывала і больш велікадушна. Моладзь прагне вялікага жыцця. Сустрэча з Хрыстом, дазвол на тое, каб нас падхапіла і вяла Яго любоў, пашырае гарызонт жыцця, дае моцную надзею, якая не падмане. Вера – гэта не ўцёкі для малаадважных людзей, але пашырэнне прасторы жыцця. Яна дазваляе адкрыць вялікі заклік, пакліканне да любові, і дае ўпэўненасць, што гэтая любоў вартая даверу, што варта ёй даверыцца, бо яе фундаментам з’яўляецца вернасць Бога, мацнейшая за ўсе нашыя слабасці.

Святло для жыцця ў грамадстве

54. Вера, прынятая і паглыбленая ў сям'і, становіцца святлом, якое асвятляе ўсе грамадскія адносіны. Як вопыт Божага айцоўства і міласэрнасці Бога яна развіваецца таксама на шляху братэрства. У «мадэрнізме» імкнуліся будаваць паўсюднае братэрства паміж людзьмі, грунтуючыся на іх роўнасці. Аднак паступова мы пачыналі разумець, што гэтае братэрства, пазбаўленае суаднясення з супольным Айцом як сваім канчатковым фундаментам, не можа ўтрымацца. Таму трэба вярнуцца да сапраўднай крыніцы братэрства. З самага пачатку гісторыі веры была гісторыя бра-тэрства, хоць яна і не была пазбаўлена канфліктаў. Бог кліча Абрагама, каб ён выйшаў з роднай зямлі, і абяцае яму, што ўчыніць з яго адзін вялікі народ, які атрымае Божае благаслаўленне (пар.  12, 1-3). У развіцці гісторыі збаўлення чалавек адкрывае, што Бог прагне, каб усе як браты ўдзельнічалі ў адным благаслаўленні, якое мае сваю паўнату ў Езусе, каб усе былі адно. Невычарпальная любоў Айца перадаецца нам у Езусе таксама праз прысутнасць брата. Вера вучыць нас заўважаць, што ў кожным чалавеку ёсць благаслаўленне для мяне, што святло Божага аблічча асвятляе мяне праз аблічча брата.

Колькі ж дабрадзействаў прынёс позірк хрысціянскай веры гораду людзей, іх сумеснаму жыццю! Дзякуючы веры мы зразумелі непаўторную годнасць кожнай асобы, якая не была настолькі відавочнай у старажытным свеце. У II стагоддзі язычнік Цэльсій абвінавачваў хрысціянаў у тым, што здавалася яму ілюзіяй і ашуканствам: меркаванне, што Бог стварыў свет для чалавека і паставіў яго на вяршыні ўсяго космасу. Таму пытаў: «Чаму сцвярджаеш, што <…> травы <…> растуць больш для людзей, чым для дзікіх жывёлаў, пазбаўленых розуму?» [46] . «Калі б хто глядзеў з неба на зямлю, ці мог бы заўважыць, што нашыя дзеянні адрозніваюцца чым-небудзь ад дзеянняў мурашак і пчол?» [47] У цэнтры біблійнай веры знаходзіцца любоў Бога, Яго канкрэтны клопат пра кожную асобу, Яго план збаўлення, які ахоплівае ўсё чалавецтва і ўсё стварэнне і які дасягае кульмінацыі ва Уцелаўленні, Смерці і Уваскрасенні Езуса Хрыста. Калі гэтая рэчаіснасць зацямняецца, тады нестае крытэрыя, які дазволіў бы адрозніць тое, што робіць жыццё чалавека каштоўным і непаўторным. Ён губляе сваё месца ў сусвеце, губляецца ў прыродзе, адмаўляецца ад сваёй маральнай адказнасці або прыпісвае сабе права абсалютнага валадара і ўладу маніпуляваць без абмежаванняў.

55. Больш за тое, вера паказвае нам любоў Бога Стварыцеля, схіляе нас да большага шанавання прыроды, так што мы прызнаём у ёй запісаную Ім «граматыку» і даручанае нам жыллё, каб мы яго ахоўвалі і даглядалі; дапамагае нам адшукаць прыклады развіцця, не кіруючыся толькі прыдатнасцю і карыслівасцю, але зважаючы на тое, што стварэнне – гэта дар, перад якім мы ўсе даўжнікі; вучыць нас шукаць справядлівыя формы кіравання, прызнаваць, што ўлада паходзіць ад Бога дзеля служэння агульнаму дабру. Вера пацвярджае таксама магчымасць прабачэння, якое вельмі часта патрабуе часу, намаганняў, цярплівасці і ўдзелу; прабачэнне магчыма, калі мы адкрываем, што дабро заўсёды першаснае і мацнейшае за зло, што слова, якім Бог пацвярджае нашае жыццё, глыбейшае за ўсялякія нашыя формы адмаўлення. Дарэчы, таксама з чыста антрапалагічнага пункту гледжання, еднасць пераўзыходзіць канфлікт; мы таксама павінны супрацьстаяць

канфліктам, але іх перажыванне павінна весці нас да іх вырашэння, пераадолення, перамянення іх у звяно пэўнага ланцуга, у развіццё дзеля еднасці.

Калі знікае вера, з’яўляецца небяспека, што знік- нуць таксама фундаменты жыцця, як асцерагае паэт Т. С. Эліот: «Можа патрабуеце, каб вам сказалі, што нават гэтыя сціплыя дасягненні, // якія абуджаюць у вас гонар за ўладкаванае грамадства, // з цяжкасцю перажывуць веру, якой удзячны за сваё значэнне?» [48] . Калі выключым Бога з нашых гарадоў, аслабне давер паміж намі, мы будзем разам толькі са страху і стабільнасць будзе пад пагрозай. Пасланне да Габрэяў сцвярджае: «Бог не саромеецца, каб яны называлі Яго сваім Богам, бо Ён падрыхтаваў ім горад» (11, 16). Выраз «не саромеецца» звязаны з публічным прызнаннем. Хоча гэтым сказаць, што Бог сваім канкрэтным дзеяннем публічна вызнае сваю прысутнасць паміж намі, сваё жаданне ўмацоўваць сувязь паміж людзьмі. Ці ж гэта мы будзем саромецца называць Бога нашым Богам? Гэта мы, у нашым публічным жыцці, не будзем вызнаваць, што Ён Ім з’яўляецца, і мы не будзем абвяшчаць веліч супольнага жыцця, якое магчыма дзякуючы Яму? Вера асвятляе грамадскае жыццё. Яна мае ў сабе творчае святло для кожнай новай хвіліны гісторыі, бо суадносіць усе падзеі да іх пачатку і паказвае прызначэнне ўсяго ў Айцу, які нас любіць.

Суцяшальная моц у цярпенні

56. Калі св. Павел піша хрысціянам у Карынце пра свае пакуты і цярпенні, ён лучыць сваю веру з абвя-шчэннем Евангелля. Па сутнасці кажа, што ў ім спаўняецца фрагмент Пісання: «Паверыў, таму прамовіў» (*2* 4, 13). Апостал прыгадвае тут словы псальма 116, у якім псальміст кліча: «Я верыў нават тады, калі казаў: “Я моцна прыгнечаны”» (в. 10). Мова пра веру часта звязана з мовай пра балесныя выпрабаванні, але св. Павел менавіта гэта лічыць найбольш пераканаўчым абвя-шчэннем Евангелля, бо ў слабасці і цярпенні аб’яўляецца і адкрываецца Божая моц, якая пераўзыходзіць нашыя слабасці і цярпенні. Сам Апостал стаіць перад аб-ліч-чам блізкай смерці, якая стане жыццём для хрысціянаў (пар. *2* 4, 7-12). Вера асвятляе нас у час вы-прабавання і менавіта ў слабасці і цярпенні становіцца зразумелым, што «мы не сябе абвяшчаем, але Езуса Хрыста, Пана» (*2* 4, 5). Адзінаццаты раздзел Паслання да Габрэяў заканчваецца ўспамінам тых, хто цярпеў за веру (пар. вв. 35-38), сярод іх асаблівае месца адводзіцца Майсею, які цярпеў знявагі дзеля Хрыста (пар. в. 26). Хрысціянін ведае, што нельга пазбегнуць цярпення, але яно можа набыць сэнс, можа стаць актам любові, адданнем сябе ў рукі Бога, які не пакідае нас, можа стаць праз гэта этапам узрастання веры і любові. Сузіраючы з’яднанне Хрыста з Айцом, таксама ў хвіліну найбольшага цярпення на крыжы (пар. *М* 15, 34), хрысціянін вучыцца ўдзельнічаць у позірку самога Езуса. Нават смерць становіцца асветленай і можа перажывацца як апошняе вызнанне веры, апошняе «выйдзі з тваёй зямлі», апошняе «прыйдзі!», сказанае Айцом, якому davяраемся з надзеяй, што Ён нас умацуе таксама падчас апошняга прыйсця.

57. Святло веры не вядзе да таго, што мы забываем пра цярпенні свету. Для якой жа колькасці людзей веры церпячыя сталі пасрэднікамі святла! Для св. Францішка з Асізі — пракажоны, а для бл. Маці Тэрэзы з Калькуты — яе ўбогія. Яны зразумелі таямніцу, заключаную ў іх. Набліжаючыся да іх, напэўна не вызвалілі іх ад усіх цярпенняў і не маглі растлумачыць кожнага зла. Вера з'яўляецца не святлом, якое рассейвае ўсю нашую цемру, але лямпай, якая ўначы кіруе нашымі крокамі, а гэтага дастаткова, каб ісці. Чалавеку, які церпіць, Бог не дае аргументацыі, якая ўсё раз'ясняе, але дае свой адказ у форме прысутнасці, якая спадарожнічае гісторыі дабра, што лучыцца з кожнай гісторыяй цярпення, каб асвятліў яе прамень святла. У Хрысце Бог пажадаў дзяліць з намі тую дарогу і ахвяраваць нам свой позірк, каб мы ўбачылі на гэтай дарозе святло. Хрыстус з'яўляецца тым, хто цярпеў боль, і таму Ён пачынальнік і завяршальнік веры (пар.  12, 2).

Цярпенне нагадвае нам, што служэнне веры агульнаму дабру заўсёды з'яўляецца паслугай надзеі, якая глядзіць перад сабой, што толькі ў Богу, у будучыні, ахвяраванай уваскрослым Езусам, нашае грамадства можа знайсці моцны і трывалы фундамент. У гэтым сэнсе вера яднаецца з надзеяй, бо нават калі бяднее святыня нашага зямнога жылля, існуе вечнае жыллё, якое Бог ужо ад-крыў у Хрысце, у Яго целе (пар. *2*  4, 16 – 5, 5). Ды-наміка веры, надзеі і любові (пар. *1*  1, 3; *1*  13, 13) робіць блізкімі нам клопаты ўсіх людзей на нашай дарозе, якая вядзе да гэтага горада, «будаўніком якога ёсць Бог» ( 11, 10), бо «надзея не асароміць» ( 5, 5).

У еднасці з верай і любоўю надзея кіруе нас да пэўнай будучыні ў іншай перспетыве, адрознай ад ілюзорных прапаноў ідалаў гэтага свету, якая дае нам новы запал і новую сілу да штодзённага жыцця. Не дазволім, каб у нас скралі надзею, не дазволім, каб яе знішчылі раптоўныя рашэнні і прапановы, якія спыняюць нас на шляху, «рассейваюць» час, перамяняючы яго ў прастору. Час заўсёды пераўзыходзіць прастору. У прасторы крышталізуюцца праекты, а час заўсёды мкне ў будучыню і пабуджае крочыць з надзеяй.

«Шчаслівая тая, якая паверыла» (Лк 1, 45)

58. У прыпавесці пра сейбіта св. Лука прыводзіць наступныя словы, у якіх Езус тлумачыць сэнс «ураджайнай зямлі», што азначае тых, «хто, пачуўшы слова, захоўвае яго ў добрым і чыстым сэрцы і прыносіць у цярплівасці плён» ( 8, 15). У кантэксце Евангелля паводле Лукі зварот да шляхетнага і добрага сэрца, да пачутага і захаванага Слова, з'яўляецца ўкрытым вобразам веры Дзевы Марыі. Той самы Евангеліст кажа нам пра памяць Марыі, пра тое, што Яна захавала ў сваім сэрцы ўсё, што чула і бачыла, каб Слова прыносіла плён у Яе жыцці. Маці Пана – гэта дасканалая ікона веры, як скажа св. Альжбета: «Шчаслівая тая, якая паверыла» ( 1, 45).

У Марыі, Дачцы Сіёна, спаўняецца доўгая гісторыя веры Старога Запавету, якая расказвае пра многіх верных жанчын, пачынаючы ад Сары, пра жынчын, у якіх, побач з Патрыярхамі, здзяйснялася Божае абяцанне і квітнела новае жыццё. Калі настала паўната часоў, Слова Божае звярнулася да Марыі, а Яна прыняла Яго ўсёй сваёй сутнасцю, каб Яно сталася ў Ёй целам і нарадзілася як святло для людзей. Св. Юстын Мучанік у сваім «Дыялогу з Трыфанам» прыгожа сказаў, што Марыя, прымаючы вестку анёла, зачала «веру і радасць» [49] . Вера Маці Езуса была плённай, а калі нашае духоўнае жыццё прыносіць плён, яно напаўняе нас радасцю, якая з'яўляецца найбольш выразным знакам велічы веры. У сваім жыцці Марыя здзейсніла пілігрымку веры, ідучы за сваім Сынам [50] . У Марыі дарога веры Старога Запавету ўключаецца ў следаванне за Хрыстом і перамяняецца Ім, бо атрымлівае позірк уцелаўлёнага Божага Сына.

59. Можам сказаць, што ў Найсвяцейшай Панне Марыі ажыццяўляецца тое, што я ўжо падкрэсліў, гэта значыць тое, што веруючы цалкам ахоплены сваім вызнаннем веры. З увагі на сваю сувязь з Езусам Марыя ўключана ў тое, у што мы верым. У дзявочым зачацці праз Марыю мы маем выразны знак Боскага сыноўства Хрыста. Спрадвечны пачатак Хрыста – у Айцу, Ён з'яўляецца Сынам у поўным і непаўторным сэнсе, і таму нара-джаецца ў часе без удзелу мужчыны. Будучы Сынам, Езус можа прынесці свету новы пачатак і новае святло, паўнату вернай любові Бога, які ахвяруецца людзям. З другога боку, сапраўднае мацярынства Марыі дало Божаму Сыну сапраўдную чалавечую гісторыю, сапраўднае цела, у якім Ён памрэ на крыжы і паўстане з мёртвых. Марыя будзе спадарожнічаць Яму аж да крыжа (пар.  19, 25), адкуль Яе мацярынства пашырылася пасля ўваскрасення і ўнебаўшэсця Езуса на кожнага вучня Яе Сына (пар.  19, 26-27). Яна будзе таксама ў Вячэрніку, каб разам з Апосталамі выпрошваць дар Духа Святога (пар.  1, 14). Такім чынам дынаміка любові паміж Айцом і Сынам у Духу напоўніла нашую гісторыю; Хрыстус прыцягвае нас да сябе, каб нас збавіць (пар.  12, 32). У цэнтры веры знаходзіцца Езус, Божы Сын, народжаны з жанчыны, які вядзе нас праз дар Духа Святога да ўсынаўлення (пар.  4, 4-6).

60. Мы звяртаемся ў малітве да Марыі, Маці Касцёла і Маці нашай веры:

О Маці, падтрымлівай нашую веру! Адкрый нас на слуханне Слова, каб мы распазналі голас Бога і Яго заклік. Абудзі ў нас жаданне ісці за Ім, выходзячы з нашай зямлі і прымаючы Яго абяцанне. Дапамажы нам, каб мы дазволілі Яго любові дакрануцца да нас, каб мы маглі дакрануцца да Яго праз веру. Дапамажы нам цалкам даверыцца Яму, верыць у Яго любоў, асабліва ў хвіліны засмучэння і крыжа, калі нашая вера паклікана да сталення. Сей у нашай веры радасць Уваскрослага. Нагадвай нам, што той, хто верыць, ніколі не будзе самотным. Навучы нас глядзець вачыма Езуса, каб Ён быў святлом на нашай дарозе. Няхай гэтае святло веры ўзрас-тае ў нас штораз больш, пакуль не настане той дзень без захаду, якім ёсць сам Хрыстус, Твой Сын, наш Пан!

*, , 29 2013 , , .*

Францішак

---

[1] *Dialogus cum Tryphone Iudaeo*, 121, 2: *PG* 6, 758.

[2] Св. Клеменс Александрыйскі, *Protrepticus*, IX: PG 8, 195.

[3] *Brief an Elisabeth Nietzsche* (11 чэрвеня 1865), у: *Werke in drei Bänden*, München 1954, 953 s.

[4] *Paradisus*, XXIV, 145-147.

[5] *Acta Sanctorum*, Iunii, I, 21.

[6] «Нават калі Сабор непасрэдна не выказваецца пра веру, ён кажа пра яе на кожнай старонцы, прызнае яе жыватворны і звышпрыродны характар, засноўвае яе ўсю і моцную і будуе на ёй сваё вучэнне. Дастатковым было б прывесці саборныя выказванні <…>, каб зразумець істотнае значэнне, якое Сабор, згодна з дактрынальнай традыцыяй Касцёла, прыпісвае веры, сапраўднай веры, якая мае моц у Хрысце, а канал пераказу ў Настаўніцкім Інстытуце Касцёла» (Павел VI, [8 сакавіка 1967]: *Insegnamenti*, V [1967], 705).

[7] Пар. напр., I Ват. Сабор, Дагмат. канст. пра каталіцкую веру *Dei Filius*, раздз. III: *DS* 3008-3020; II Ват. Сабор, Дагмат. канст. пра Божае Аб’яўленне *Dei Verbum*, 5; , 153-165.

[8] Пар. V, 1: *PG* 33, 505A.

[9] *In Psal.* 32, II, s. I, 9: *PL* 36, 284.

[10] M. Buber, *Die Erzählungen der Chassidim*, Zürich 1949, 793.

[11] *Émile*, Paris 1966, 387.

[12] *Lettre Christophe de Beaumont*, Lausanne 1993, 110.

[13] Пар. *In Ioh. Evang.*, 45, 9: *PL* 35, 1722-1723.

[14] Частка II, IV.

[15] *De continentia*, 4, 11: *PL* 40, 356.

[16] *Vom Wesen katholischer Weltanschauung* (1923), у: *Unter-scheidung des Christlichen. Gesammelte Studien 1923-1963*, Mainz 1963, 24.

[17] XI, 30, 40: *PL* 32, 825.

[18] Пар. , 825-826.

[19] Пар. *Vermischte Bemerkungen / Culture and Value*, G.H. von Wright (рэд.), Oxford 1991, 32-33; 61-64.

[20] *Homiliae in Evangelia*, II, 27, 4: *PL* 76, 1207.

[21] Пар. *Expositio super Cantica Canticorum*, XVIII, 88: *CCL*, *Continuatio Mediaevalis* 87, 67.

[22] , XIX, 90: *CCL*, *Continuatio Mediaevalis* 87, 69.

[23] «Перад Богам, які аб'яўляецца, трэба захоўваць паслухмянасць веры (пар. 16, 26; пар. 1, 5; *2* 10, 5-6), праз якую чалавек цалкам дабравольна даручае сябе Яму, выказваючы "поўнае падпарадкаванне розуму і волі Богу, які аб'яўляецца", і добраахвотна прымае дадзенае Ім Аб'яўленне. Каб дасягнуць такой веры, неабходна апераджальная і падмацавальная Божая ласка і ўнутраная падтрымка Духа Святога, які ўзрушвае і скіроўвае сэрца да Бога, адкрывае вочы розуму і дае "асалоду ўсім, хто прымае праўду і верыць у яе". Каб паглыбіць разуменне Аб'яўлення, той жа Дух Святы няспынна ўдасканальвае веру з дапамогай сваіх дароў» (II Ват. Сабор, Дагмат. канст. пра Божае Аб'яўленне *Dei Verbum*, 5).

[24] Пар. H. Schlier, *Meditationen über den Johanneischen Begriff der Wahrheit*, у*: Besinnung auf das Neue Testament. Exegetische Aufsätze und Vorträge* 2, Freiburg, Basel, Wien 1959, 272.

[25] Пар. *S. Th.* III, q. 55, a. 2, ad 1.

[26] *Sermo* 229/L, 2: *PLS* 2, 576: «*Tangere autem corde, hoc est credere*».

[27] Пар. Энц. *Fides et ratio* (14 верасня 1998), 73: *AAS* (1999), 61-62.

[28] Пар. *Confessiones*, VIII, 12, 29: *PL* 32, 762.

[29] *De Trinitate*, XV, 11, 20: *PL* 42, 1071: *«verbum quod intus lucet».*

[30] Пар. *De civitate Dei*, XXII, 30, 5: *PL* 41, 804.

[31] Пар. Кангрэгацыя Веравучэння, Дэкл. *Dominus Iesus* (6 жніўня 2000), 15: *AAS* 92

(2000), 756.

[32] *Demonstratio apostolicae praedicationis*, 24: *SC* 406, 117.

[33] Пар. Св. Бонавэнтура, *Breviloquium*, *Prol*.: *Opera omnia*, V, Quaracchi 1891, 201; *In I Sent., proem*., q. 1, resp.: *Opera Omnia*, I, Quaracchi 1891, 7; Св. Тамаш Аквінскі, *S. Th*., I, q. 1.

[34] Пар. *De Baptismo*, 20, 5: *CCL* 1, 295.

[35] Дагмат. канст. пра Божае Аб’яўленне *Dei Verbum*, 8.

[36] Пар. II Ват. Сабор, Канст. пра Літургію *Sacrosanctum Concilium*, 59.

[37] Пар. *Epistula Barnabae*, 11, 5: *SC* 172, 162.

[38] Пар. *De nuptiis et concupiscentia*, I, 4, 5: *PL* 44, 413: «*Habent quippe intentionem generandi regenerandos, ut qui ex eis saeculi filii nascuntur in Dei filios renascantur*».

[39] II Ват. Сабор, Дагмат. канст. пра Божае Аб’яўленне *Dei Verbum*, 8.

[40] *In nativitate Domini sermo* 4, 6: *SC* 22, 110.

[41] Пар. Св. Ірэный, *Adversus haereses*, I, 10, 2: *SC* 264, 160.

[42] Пар. , II, 27, 1: *SC* 294, 264.

[43] Пар. Св. Аўгустын, *De sancta virginitate*, 48, 48: *PL* 40, 424-425: «*Servatur et in fide inviolata quaedam castitas virginalis, qua Ecclesia uni viro virgo casta cooptatur*».

[44] Пар. *An Essay on the Development of Christian Doctrine*, Uniform Edition: Longmans, Green and Company, London, 1868-1881, 185-189.

[45] Пар. II Ват. Сабор, Дагмат. канст. пра Божае Аб’яўленне *Dei Verbum*, 10.

[46] Арыген, *Contra Celsum*, IV, 75: *SC* 136, 372.

[47] , 85: *SC* 136, 394.

[48] «*Choruses from The Rock*», у: *The Collected Poems and Plays* 1909-1950, New York 1980, 106.

[49] Пар. *Dialogus cum Tryphone Iudaeo*, 100, 5: *PG* 6,710.

[50] Пар. II Ват. Сабор, Дагм. канст. пра Касцёл *Lumen gentium*, 58.

Copyright © Dicastero per la Comunicazione - Libreria Editrice Vaticana